

МУЖЧЫНСКІЯ АБАВЯЗКІ НІХТО НЕ АДМЯНЯЎ

Сямейная газета

СЯМ'Я РЭКАНСТРУКТАРАЎ І ПОШУКАВІКОЎ

Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ЛЮТАГА 2024 г. ЧАЦВЕР № 22 (30156)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр ПАРХОМЧЫК, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У апошнія гады прамысловасць не проста захавала свае ўнікальныя магчымасці, але і сур'ёзна мадэрнізавалася. Гэта можна бачыць у тых узорах тэхнікі, якія сёння выпускаюць нашы асноўныя прадпрыемствы. Гэты працэс знаходзіцца ў пастаянным развіцці. Сёння гэта візітная картка Беларусі. Тая прадукцыя, якую выпускае наша прамысловасць, вядома далёка за межамі нашай краіны. Вельмі важна, што мы змаглі прымножыць тое, што нам у спадчыну засталося ад вялікай дзяржавы — Савецкага Саюза. Мы працягнулі работу і стварылі сучасную карцінку ўсіх нашых прамысловых прадпрыемстваў. Былі розныя перыяды і складанасці на этапе развіцця. Практычна з усімі цяжкасцямі мы паспяхова справіліся. І сёння наша прамысловасць запатрабавана не толькі ўнутры, але і за межамі нашай краіны».*

## КОРАТКА

- **Жыровіцкі манастыр стаў самым папулярным месцам турыстаў у Гродзенскай вобласці летась.**
- Сярэдні заробак будаўнікоў у Беларусі за мінулы год вырас на чвэрць.
- **У Беларусі стартаваў конкурс «Найлепшы праект паляпшэння ў краіне, арганізацыі, галіне».**
- «БЕЛДЖЫ» ў 2023 годзе вырабіў амаль 68 тыс. аўтамабіляў.
- **У Беларусі пры фарміраванні базы незанятых у эканоміцы будзе ўлічвацца інфармацыя МУС Расіі.**

ISSN 1990 — 763X

24022

# На паштовым маршруце



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Ігар СУХАРНІКАЎ працуе вадзіцелем у аўтатранспартнай вытворчасці РУП «Белпошта» ў сталіцы. Сфатаграфаваць яго ўдалося у пачатку рабочага дня, у 4 гадзіны раніцы. Ігар прымаў карэспандэнцыю і пасылкі, каб развезці па сваім маршруце. Гэты маршрут у дзень складае больш за 70 кіламетраў. Адных толькі пасылак штодня развозіцца каля шасцідзесяці, не лічачы пісьмаў і прэсы.

Нерухомасць

## КАЛІ ДЗЯСЯТЫ АЎКЦЫЁН АКАЗВАЕЦЦА РЭЗУЛЬТАТЫЎНЫМ

### Як у Брэсцкай вобласці вядзецца работа па прыцягненні ў абарот дзяржаўнай маёмасці, што не выкарыстоўваецца

**Па пытаннях прыцягнення ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, Брэсцкая вобласць летась паказала найлепшы ў краіне вынік: план удалося выканаць на 75,7 працэнта, фактычна захаваўшы ўзровень мінулага года. Варта адзначыць, што восем гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў справіліся з гадавым заданнем у поўным аб'ёме. Пра некаторыя вынікі года, прыярытэты і асаблівасці работы ў мінулым годзе сённяшняя размова з намеснікам старшыні камітэта дзяржаўнай маёмасці Брэсцкага аблвыканкама Надзеяй СТРАЛЬЦОВАЙ.**

**Салон прыгажосці і фітнес-клуб**

Цікава, што месцам для гутаркі Надзея Мікалаеўна прапанавала выбраць не кабінет, а адзін з аб'ектаў, які ў свой час быў прададзены прыватным прадпрыемствам, атрымаў новае жыццё і служыць людзям. Мы накіраваліся ў самы цэнтр Брэста. Па вуліцы Гогаля, 61 знаходзіцца трохпавярховы будынак, здадзены ў эксплуатацыю ў 1954 годзе. Доўгі час ён выкарыстоўваўся ў якасці жылога фонду, тут быў гарадскі інтэрнат. Цяпер на першым паверсе знаходзіцца салон прыгажосці «Кантынент», другі і трэці паверхі займае фітнес-клуб «Мфіт».

СТАР. 4

Інклюзія

## «У МЯНЕ ЯШЧЭ ШМАТ ТАЛЕНТАЎ»

### Аб чым расказалі ўдзельнікі гродзенскага этапу рэспубліканскага фестывалю «Час моцных»

**Фестываль роўных магчымасцяў ладзіцца ў нашай краіне ўпершыню. І гэта сапраўды маштабнае відовішча. Напрыклад, у Гродне конкурсная праграма складалася з трох аддзяленняў, а на ўдзел у канцэртнай праграме было пададзена 55 заявак. Фестываль доўжыўся амаль пяць гадзін. Усе заяўнікі змаглі паказаць свае таленты і майстэрства на сцэне Гродзенскай абласной філармоніі. Кожнае выступленне суправаджалася відэакліпамі на вялікім экране. Але найбольшы зарад станоўчых эмоцый сыходзіў ад саміх артыстаў, якія, нягледзячы на цяжкасці, радуюцца жыццю і дораць радасць іншым.**

СТАР. 3



Парламенцкі дзённік

# У ІНТАРЭСАХ КАНКРЭТНАЙ КАТЭГОРЫІ ГРАМАДЗЯН І НАРОДА Ў ЦЭЛЫМ

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разгледзелі шэраг новаўвядзенняў і азнаёміліся з праектам абноўленай Ваеннай дактрыны

**У першым чытанні адобраны законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Для пэўных катэгорый жанчын павялічваецца максімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах. Пад заканадаўчую навацыю трапяць навучэнкі і студэнткі, маладыя спецыялісты, іншыя асобы, якія пачынаюць працоўную дзейнасць, жанчыны, зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных да заканчэння шасці месяцаў пасля звальнення (заканчэння службы, завяршэння навучання). Для іх павялічыцца і мінімальны памер дапамогі па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці. Павышаецца ўзровень сацыяльнай абароненасці і тых сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, у тым ліку пасля дасягнення імі ўзросту 18 гадоў. Акрамя таго, будзе прызначацца дапамога на дзіця, якое выхоўваецца маці, калі бацька дзіцяці, які абавязаны выплачваць аліменты, праходзіць тэрміновую ваенную (або альтэрнатыўную) службу.**

Як падкрэсліла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Марына ШКРОБ**, дзяржава заўсёды клапоціцца аб сем'ях, якія выхоўваюць дзяцей. «І перш за ўсё ўдзяляе ўвагу заканадаўству, у якім сказана аб дапамозе гэтым сем'ям, — канкрэтызавала дэпутат. — Мяняюцца выплаты, якія атрымліваюць нашы жанчыны па цяжарнасці і родах. Гэта датычыцца асабліва ўразлівых слаёў насельніцтва: размова ідзе аб студэнтах, маладых спецыялістах, тых, хто страціў работу, але на працягу шасці месяцаў паспеў стаць на ўлік па беспрацоўі. Мяняюцца выплаты сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Мы разумеем, якая гэта вялікая адказнасць і работа. Выплаты будуць разлічаны і на дзяцей-інвалідаў, якія дасягнулі 18 гадоў. Такім чынам, паляпшаецца дабрабыт гэтых сем'яў».

Па словах парламентарыя, законапраект накіраваны на тое, каб дапамога сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, стала адраснай. Выплаты будуць прывязвацца да бюджэту пражытачнага мінімуму. Адпаведна, з яго ростам выплаты чакае індэксацыя.

### Новыя паўнамоцтвы следчых

У першым чытанні дэпутаты разгледзелі законапраект «Аб змяненні законаў» (па пытаннях Следчага камітэта). У адпаведнасці з ускладзенымі задачамі, ведамства надзяляецца паўнамоцтвам без згоды фізічных асоб атрымліваць звесткі з інфармацыйных рэсурсаў (сістэм), якія змяшчаюць персанальныя даныя, і мець доступ, у тым ліку аддалены, да гэтых рэсурсаў (сістэм). Павялічваецца гранічны ўзрост прыёму на службу ў Следчы камітэт — з 25 да 28 гадоў. Мяркуецца, што грамадзяне, прынятыя (залічаныя) ва ўстанову вышэйшай адукацыі Міністэрства ўнутраных спраў для атрымання вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях для Следчага камітэта, будуць мець статус супрацоўніка гэтага ведамства.

### Гандаль і грамадскае харчаванне — па спрошчаных правілах

Прыняты ў другім чытанні законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання». У прыватнасці, прапануецца забараніць устанаўліваць суб'ектамі гандлю, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль харчовымі таварамі з дапамогай арганізацыі гандлёвай сеткі, і пастаўшчыкамі харчовых тавараў, якія ажыццяўляюць пастаўкі гэтых тавараў у гандлёвыя сеткі, у дагаворах, якія прадугледжваюць пастаўкі харчовых тавараў, абавязацельствы пастаўшчыка кампенсаваць затраты, звязаныя з утылізацыяй або знішчэннем непрададзеных харчовых тавараў. Акрамя таго, плануецца забараніць суб'ектам гандлю вяртанне пастаўшчыкам нерэалізаваных харчовых тавараў, на якія тэрмін прыдатнасці (тэрмін захоўвання) устаноўлены да трыццаці дзён уключна.

У рамках рэалізацыі Саюзнай праграмы выключаюцца абавязкі суб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання: узгадняць з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі рэжым работы гандлёвых аб'ектаў і аб'ектаў грамадскага харчавання ў начны час. У выпадку рэалізацыі алкагольных, слабаалкагольных напіткаў і піва патрабаванне аб узгадненні рэжыму работы ў начны час захоўваецца. Не трэба будзе прадстаўляць у мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы апавяшчэнне аб пачатку ажыццяўлення аптовага, роз260нічнага гандлю, грамадскага харчавання.

### Быць гаспадаром на сваёй зямлі

Пасля разгляду законапраектаў у Авальнай зале адбылася сустрэча дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з **начальнікам Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першым намеснікам міністра абароны Віктарам ГУЛЕВІЧАМ,** які расказаў аб праекце абноўленай Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь.

У размове з журналістамі начальнік Генштаба Узброеных Сіл падкрэсліў, што самае галоўнае — Ваенная дактрына захавала міралюбівую палітыку Беларусі. «Ні да аднаго народа мы не адносімся як да сваіх ворагаў, а тыя кіраўнікі, якія захоўваюць негатыўную рыторыку ў адносінах да нашай краіны, няхай вывучаюць нашу Ваенную дактрыну пасля яе апублікавання», — адзначыў Віктар Гулевіч.

Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Аляксандра МАРКЕВІЧА,** Ваенная дактрына — гэта сутнасць поглядаў на забеспячэнне ваеннай бяспекі. «Асноўная мэта, якая праследуецца Ваеннай дактрынай, — не дапусціць вайны на беларускай тэрыторыі і ў адносінах народа Беларусі, гэта значыць, забяспечыць мірнае жыццё і магчымасць далейшага развіцця нашай суверэннай беларускай дзяржавы, — адзначыў дэпутат. — Што датычыцца навацый, з'явілася цэлая глава, якая прысвечана саюзніцкім абавязацельствам у рамках Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і іншых міждзяржаўных структур па забеспячэнні бяспекі. Вельмі сур'ёзны фактар стрымлівання — размяшчэнне тактычнай ядзернай зброі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Гэты важны аспект таксама закранаецца ў Ваеннай дактрыне. Гэты дакумент будзе садзейнічаць таму, каб беларускі народ быў гаспадаром на сваёй зямлі, развіваўся, меў магчымасць і далей выходзіць з мірнымі ініцыятывамі і рэалізоўваць іх на практыцы».

**Вераніка КАНЮТА.**

На перспектыву

# ПЛЁННАЯ ЗАКАНАДАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І ПАГЛЫБЛЕННЕ МІЖНАРОДНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

## Адбылося пасяджэнне Савета Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу

**Члены Савета разгледзелі інфармацыю аб дапаўненні парадку дня дзясятай сесіі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання, справаздачы дэпутатаў пра службовыя камандзіроўкі за мяжу, зацвердзілі План міжнароднага парламенцкага супрацоўніцтва ніжняй палаты парламента на 2024 год.**

Як адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА,** нягледзячы на тое, што да завяршэння дзейнасці дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання застаецца няшмат часу, работы ў іх яшчэ немала. Ён расказаў, што на цяперашні момант у рабоце знаходзіцца 16 законапраектаў. Сярод іх — «Аб адказным абыходжанні з жывёламі», «Аб гандлёва-прамысловай палаце», «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі», «Аб крэдытных гісторыях» і іншыя. Уладзімір Андрэйчанка сарыентаваў дэпутацкі корпус на сур'ёзную работу і паставіў задачу прыняць законапраекты цяперашнім скліканнем парламентарыяў — а значыць, на працягу лютага.

Спікер ніжняй палаты парламента нагадаў, што ў панядзелак у Санкт-Пецярбургу адбылося пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы. «На ім быў разгледжаны шэраг пытанняў, галоўныя — рэалізацыя прыярытэтных кірункаў па выкананні Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, каардынацыя нашай работы з Расійскай Федэрацыяй у сферы знешняй палітыкі, прыняты асноўныя кірункі нашай работы ў рамках Саюзнай дзяржавы на 2024—2025 гады, — удакладніў ён. — Трэба сказаць, што ў гэтым плане за тры гады вельмі шмат было зроблена. Вядома, тон усёй гэтай работы задавалі прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Вялікую работу правялі і дэпутаты Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, дэпутаты нацыянальных парламентаў».

Па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, нягледзячы на санкцыйны ціск, які прадпрымаецца ў адносінах да дзвюх краін, па выніках 2023 года ў Беларусі валавы ўнутраны прадукт вырас на 3,9 %, у Расійскай Федэрацыі — на 3,5 %. «Поспехі даволі сур'ёзныя, — рэзюмаваў спікер. — Больш за тое, наш абарот з Расійскай Федэрацыяй таварамі і паслугамі па выніках 2023 года складзе каля 54 млрд долараў. Упершыню ў гісторыі нашай сумеснай работы з Расіяй мы дасягнулі такой лічбы. І самае галоўнае, у нас станоўчы гандлёвы баланс».

Кажучы аб супрацоўніцтве з Расіяй, Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу і на важнасць удасканалення прававой базы. «Перш за ўсё яна павінна быць накіравана на стварэнне роўных умоў і для суб'ектаў гаспадарання, і для грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, — заўважыў ён. — Будзем прама казаць: сёння ў гэтым плане не ўсё зроблена». Па словах спікера, дэпутаты павінны быць датычнымі і да пытання стварэння імпартазамяшчальных вытворчасцяў, сумесных прадпрыемстваў з Расійскай Федэрацыяй.

Кажучы аб супрацоўніцтве з міжнароднымі арганізацыямі, у прыватнасці АБСЕ, Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што трэба працягваць работу і адстойваць свае пазіцыі.

Кажучы аб міжнароднай парламенцкай дзейнасці дэпутацкага корпуса ў бягучым годзе, **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ** адзначыў, што плануецца працяг паглыблення ўзаемадзеяння з рэгіянальнымі парламенцкімі структурамі, такімі як Парламенцкі Сход Саюза Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц СНД, Парламенцкая Асамблея АДКБ.

«Пры гэтым плануецца шырокі спектр двухбаковых кантактаў, — удакладніў дэпутат. — Кантакты будуць рэалізоўвацца з парламентамі краін Азіі. Пры гэтым асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца рэалізацыі дамоўленасцяў, якія ўжо дасягнуты ў мінулым годзе, а гэта ўзаемадзеянне з Кітаем, Інданезіяй, В'етнамам. Акрамя таго, будзе выконвацца дарожная карта дамоўленасцяў з Егіптам, Іранам і Індыяй. Таксама плануем працягнуць наша ўзаемадзеянне з прадстаўнікамі парламенцкіх партый, парламентаў заходніх дзяржаў, якія настроены на дыялог, выпрацоўку ўзаемапрымальных рашэнняў, якія дазволяць нам забяспечыць мірны і з найменшымі выдаткамі пераход да шматпалярнага свету».

**Вераніка КАНЮТА.**

# У ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ БУДЗЕ ПРЭТЭНДАВАЦЬ 265 КАНДЫДАТАЎ, У МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ — 18 802

## Рэгістрацыя завершана, пачалася агітацыя

**Акруговыя камісіі правялі рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і мясцовых Саветаў дэпутатаў. Аб гэтым журналістам расказаў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА.**

Такім чынам, на 110 дэпутацкіх месцаў Палаты прадстаўнікоў на сённяшні момант будзе прэтэндаваць 265 кандыдатаў. «З іх моладзі — грамадзян да 31 года —— дзесяць прэтэндэнтаў, — удакладніў старшыня Цэнтрвыбаркама. — Самаму маладому кандыдату ў дэпутаты 23 гады. Сярод кандыдатаў у дэпутаты — 92 жанчыны. Мы бачым, што мужчыны праявілі большую актыўнасць па вылучэнні сваіх кандыдатур у склад парламента. Акрамя таго, вылучаюцца чатыры пенсіянеры. Самаму сталаму кандыдату ў дэпутаты 66 гадоў. Адзін чалавек — беспрацоўны. У цэлым, конкурс на месца ў Палату прадстаўнікоў складае 2,4 чалавека на месца».

Што датычыцца мясцовых Саветаў дэпутатаў, то на 12 514 месцаў будзе прэтэндаваць 18 802 прадстаўнікі. Па словах Ігара Карпенкі, і тут ёсць пэўны конкурс. Пры гэтым ён адзначыў, што традыцыйна ў некаторых Саветах, у першую чаргу сельскіх, выбары праходзяць безальтэрнатыўна.

Як адзначыў старшыня ЦВК, у працэсе вылучэння кандыдатаў у дэпутаты праявілі актыўнасць палітычныя партыі. «Больш за ўсё кандыдатаў у дэпутаты вылучыла беларуская партыя «Белая Русь», — канкрэтызаваў Ігар Карпенка. — На другім месцы — Ліберальна-дэмакратычная партыя. На трэцім — Камуністычная партыя Беларусі. І на чацвёртым — Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці».

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі нагадаў, што з 31 студзеня пачаўся перыяд агітацыі. «Зарэгістраваныя кандыдаты змогуць скарыстацца сваім канстытуцыйным і выбарчым правам і данесці да ведама выбаршчыкаў свае перадвыбарныя праграмы, правесці сустрэчы, выступіць у сродках масавай інфармацыі, правесці масавыя мерапрыемствы з мэтай прыцягнення выбаршчыкаў як на выбарчыя ўчасткі, так і на галасаванне за канкрэтнага кандыдата ў дэпутаты», — адзначыў ён.

Пры гэтым Ігар Карпенка нагадаў, што ў перыяд правядзення агітацыі Выбарчы кодэкс гарантуе ўсім роўныя правы і магчымасці. «Мясцовыя органы ўлады ўстанавілі месцы правядзення масавых мерапрыемстваў, сустрэч з выбаршчыкамі, месцы, дзе можна размяшчаць друкаваныя матэрыялы, праграмы, — канстатаваў старшыня Цэнтрвыбаркама. — ЦВК вынес адпаведную пастанову на выдзяленне эфірнага часу на радыё і тэлебачанні для кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Разам з тым кандыдаты са сваіх фондаў таксама могуць аплаціць дадатковыя крыніцы інфармацыі як у лічбавых сродках масавай інфармацыі, так і ў друкаваных СМІ. Пры гэтым варта разумець, што кандыдаты ў дэпутаты павінны знаходзіцца ў роўных умовах».

У адпаведнасці з заканадаўствам аб масавых мерапрыемствах, кандыдаты ў дэпутаты могуць ва ўстаноўленыя тэрміны падаць заяўку на правядзенне масавых мерапрыемстваў. Пры гэтым, як падкрэсліў Ігар Карпенка, забаронена агітацыя, якая заклікае выступаць супраць канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, да яго гвалтоўнага звяржэння, ігнараваць і не хадзіць на выбары, а таксама агітацыя, якая сее нацыянальную, расавую, этнічную і сацыяльную варожасць.

Падрабязную інфармацыю аб усіх этапах выбарчага працэсу можна знайсці на сайце Цэнтральнай выбарчай камісіі.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «У МЯНЕ ЯШЧЭ ШМАТ ТАЛЕНТАЎ»

## Артыстычны дэсант

Вядома, трапіць на фінальны этап фестывалю, які адбудзецца напачатку мая ў Мінску, давядзецца далёка не ўсім. Але і цяпер усіх удзельнікаў можна назваць пераможцамі: і выканаўцы, і калектывы атрымалі дыпломы рэгіянальнага этапу рэспубліканскага фестывалю «Час моцных». Трэба сказаць, што фестываль вельмі дарэчы. Як прызналіся прадстаўнікі цэнтраў сацыяльнай рэабілітацыі, такія выхады «ў свет» для іх падапечных — сапраўднае свята. На сцэне забываецца напружаная падрыхтоўчая работа, якая вялася на працягу некалькіх месяцаў, а застаюцца толькі выступленне і гледачы.

Большасць удзельнікаў — наведвальнікі цэнтраў сацыяльнай рэабілітацыі і абілітацыі інвалідаў. Але не толькі. Вялікі «дэсант» прадставіла аб'яднанне Беларускага таварыства інвалідаў па зроку, многія выканаўцы працуюць на прадпрыемстве «Фільтр». Іх выступленні, а гэта амаль 20 нумароў, склалі цэлае аддзяленне канцэртнай праграмы. І старажылам тут можна назваць народны вакальны ансамбль «Іаланта», гісторыя якога пачынаецца з далёкага 1950 года. Тэатральную замалёўку прадставіў народны тэатр мініяцюр «Перасмешнік». Музыканты і вакалісты зачароўвалі сваім выкананнем як беларускіх народных, так і сучасных кампазіцый.

## Рытмы на дотык

Каля дзесяці нумароў прадставілі артысты Дома культуры прадпрыемства «Цветлит» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па слыху». У іх ліку выступіў музычны калектыў «Рытм» Гродзенскай спецыяльнай школы-інтэрната. Яны — самыя юныя ўдзельнікі фестывалю. **Педагог-арганізатар Юлія БУЛЫКА** зазначае, што гэта першае выступленне другакласніц на такой вялікай сцэне, таму дзяўчынкі вельмі хваляваліся, але ім падабаецца выступаць, асабліва рыхтавацца — накручваць валасы, накладваць грым. Сёння яны прадставілі лялек, якія танцуюць. І іх задача — перадаць тыя самыя лялечныя рухі.

— У дзяцей ёсць слыхавыя апараты, але танцуюць нават поўнасцю глухія. Папершае, ідзе рытм ад падлогі, па-другое, кіраўнік паказвае, што трэба рабіць, — расказвае **харэограф Наталля МІХАЙЛАВА**. — Бывае, што дзяўчынка не чуе, але ў яе так развіта пачуццё рытму, што яна лепш будзе выконваць элементы, чым тая, што крыху чуе. У яе моцная мышачная памяць. Наша праграма рытмікі адрозніваецца ад звычайных метадаў навучання, бо



заняткі нясуць карэкцыйны характар, яны маюць пэўныя задачы.

Маленькія дзяўчынкі жвава пабеглі пасля выступлення пераапранацца. Ім дапамагалі педагогі. Даведалася, што старэйшыя дзяўчаты гэтага калектыву выступалі ў дзіцячым рэспубліканскім фестывалі «Вясёлкавы карагод», атрымалі некалькі дыпломаў.

## Закуліссе

Самыя цікавыя знаёмствы адбыліся там, дзе артысты рыхтуюцца да выхаду на сцэну. Трэцяе аддзяленне сабрала значную колькасць вакальных і танцавальных калектываў. Тут прадстаўлены ўсе раёны вобласці. Звяртаюць на сябе ўвагу яркія самабытныя касцюмы танцораў. За кулісамі віруе адмысловае жыццё: хтосьці рыхтуецца да выхаду, хтосьці пераводзіць дух пасля выступлення. Такая ўзрушанасць зразумелая, кажуць прадстаўнікі творчага клуба «Лицедеи» з Воранава. Конкурс вельмі адказны, усім хочацца трапіць у фінал. У Гродна калектыў прывёз адну з вясёлых беларускіх песень з падтанцоўкай. Па словах **спецыяліста па сацыяльнай рабоце раённага аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі і абілітацыі інвалідаў Дануты МАТЫЛЁНАК**, калектыў часта выязджае з канцэртамі па раёне, на святы вёсак, у дамы сумеснага пражывання, прымае ўдзел у фестывалях. Выступалі і на «Славянскім базары». Усе ўдзельнікі па стане здароўя не могуць працаваць, але з задавальненнем займаюцца творчасцю.

— Мне не цяжка тут займацца, наадварот, вельмі цікава ездзіць, выступаць, можна і на людзей паглядзець, і сябе паказаць, — дзеліцца сваімі эмоцыямі **удзельніца калектыву Алеся КУШАЛЕВІЧ**. — У мяне многа талентаў, я іх развіла яшчэ падчас вучобы ў Гродзенскай спецыялізаванай школе.

Алеся займаецца бісерапляценнем, яна дыпламант творчых конкурсаў Гродзенскай вобласці, яе работы выстаўлены ў Мінску. А між тым яна інвалід па зроку і амаль не бачыць.

У кулуарах знаёмлюся з калектывам аддзялення дзённага наведвання Кастрычніцкага раёна Гродна. Тэатральны гурток тут — адзін з самых папулярных.

— Гэта нашы мясцовыя зоркі, яны заўсёды на віду, аднак за гэтым усім стаіць вялікая праца: трэба вывучыць тэкст і словы, справіцца з хваляваннем, але гэта дае стымул быць лепшымі, — расказвае **мастацкі кіраўнік Яніна АЎГІЖЭНЬ**. — Ніхто не адмаўляецца ўдзельнічаць, хоць гэта і складана для многіх, мы рыхтуем адно выступленне не менш за тры месяцы.

На фестывалі калектыў прадставіў кампазіцыю на песню «Бульба дэнс». Гэты нумар яны стварылі, каб сказаць аб вельмі блізкім і зразумелым для ўсіх. «Гэта наша жыццеўстойлівасць, наш эканамічны складнік, усім патрэбны прадукт. Мы вырашылі аб гэтым весела, з гумарам расказаць», — паясніла мастацкі кіраўнік.

## Школа дабрыні

Калядны настрой стварыў для ўсіх гледачоў абрадавы танец «Заінька», які прадставіў калектыў «Энергія» Шчучынскага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. **Загадчыца аддзялення Алена КРАСКО** расказала, што ў іх цэнтры працуе ажно сем гурткоў, дзе займаюцца вырабамі сувенірнай прадукцыі, ёсць тэатральны і рукадзельны гурткі, фларыстычная майстэрня, вядуцца заняткі па прапагандзе здаровага ладу жыцця.

Прадстаўнікі з Ваўкавыска расказалі аб сваёй салістцы Святлане Журко. Яна з дзяцінства мае інваліднасць па зроку, але ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання вельмі ганарацца сваёй падапечнай. Святлана сама піша музыку і песні. Разам з танцавальным калектывам «Стукі сэрца» прымала ўдзел у «Славянскім базары» і стала яго дыпламантам. А яшчэ тут ганарацца ўмовамі, якія створаны для наведвальнікаў сацыяльнага цэнтра. Па словах **спецыяліста Таццяны КУБІЦКАЙ**, нядаўна адкрыты яшчэ адзін корпус з трэнажорнай залай, душавымі, сэнсарнымі пакоямі. Цэнтр ніколі не пустуе, тут ёсць чым заняцца кожнаму.

Звяртаю ўвагу на вельмі прыгожыя, ну проста ўнікальныя касцюмы. Аказалася, калектыў прыехаў з Лідскага раёна. Ён складаецца з дзвюх груп — танцавальнай «Рамантыкі» і вакальнай «Браганы». А касцюмы пашыты з дапамогай самiх удзельнікаў. Па словах **загадчыцы раённага аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі і абілітацыі Ганны СЕРГЕЕВІЧ**, закончылі шыць літаральна напярэдадні. А ўсяго ў артыстаў іх тры камплекты. На конкурсе яны выканалі вакальна-харэаграфічную кампазіцыю «Бацькава булка». Кажуць, што песню часта выконваюць на розных святах і фестывалях. Падчас прэзентацыі нумара згадваліся шматлікія іх узнагароды, у тым ліку міжнародныя. Вядомы трэнд набірае папулярнасць і ў музычным жанры, прычым нават за межамі краіны.

Дарэчы, пасля выступлення артыстаў міжволі стала сведкай вельмі кранальнай сітуацыі. Адна з удзельніц калектыву раптам расплакалася, аказалася, што яна збілася падчас танца і вельмі з-за гэтага перажывала. Яе настрой адразу быў заўважаны. Літаральна ўвесь калектыў пачаў яе супакойваць. Работнікі цэнтра паабяцалі, што наступным разам лепш падрыхтуюцца, і тады ніякіх непрыемнасцяў не будзе.

— Нашы выхаванцы вельмі чулыя і спагадлівыя, — заўважыла **кіраўнік гуртка Вікторыя ГАЙДЗІС**. — Напачатку было складана працаваць, у многіх розныя характары, да кожнага шукалі падыход. Падчас рэпетыцый людзі перажываюць з-за сваіх памылак, але мы падбадзёрваем адзін адных, разам вучымся дабрыні.

Менавіта такое ўражанне пакінуў і сам фестываль. Так шчыра і прыгожа даносілі артысты да гледачоў свае эмоцыі ў песнях, вершах і танцах, што было зразумела: толькі дабрыня выратуе гэты свет, і ніяк інакш.

**Сняжана КУРАТЧЫК, намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама:**

— Арганізатарамі фестывалю «Час моцных» з'яўляюцца Міністэрства культуры, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, абласныя выканаўчыя камітэты. Адбор выступленняў у нас праводзіўся экспертнай камісіяй у складзе прадстаўнікоў упраўлення культуры, камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама, творчых работнікаў, выкладчыкаў ВНУ і каледжаў. Удзельнікі маглі скарыстацца дапамогай валанцёраў. На рэгіянальны фестываль атрымалі пуцёўкі больш за паўсотню заяўнікаў. Творчыя нумары падзяляліся на некалькі намінацый. Усе атрымалі дыпломы рэгіянальнага этапу. Па выніках экспертная камісія вызначыла творчыя нумары, якія будуць прапанаваны рэжысёру фінальнага рэспубліканскага туру, які адбудзецца напачатку мая ў форме гала-канцэрта ў Мінску. Дзякуючы роўным магчымасцям, людзі з інваліднасцю дэманструюць не толькі свой талент, але з'яўляюцца прыкладам стойкасці і аптымізму.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

---

Па сутнасці

# ДАЙСЦІ ДА БУДУЧЫНІ



***«Вы бачылі лес,// дзе прагал скразны?// Скажыце, вы бачылі бор той,// дзе кожнай другой няма сасны // ці сама меней — чацвёртай?// Тое ж было і з народам маім. // Сякера ваеннай навалы // прайшлася бязлітасна па ім, // і — прагалы, прагалы...»*** **Памятаеце, як вобразна адзін беларускі паэт апісаў трагедыю нашага народа ў сваім «Рэквіеме...»? «Ізноў пра вайну? — спытаецца чытач. — Навошта? Колькі ж можна ўжо?» І сапраўды, для міралюбівага беларускага характару прыкрая і агідная ўся гэта ваеншчына. Нам, як і нашым продкам, больш даспадобы палеткі засяваць збожжам, душы і розум дзяцей — разумным, добрым, вечным...**

А што датычыцца мяча ў працавітых, натруджаных руках беларуса, то гэта справа вымушаная. Геаграфія, месцазнаходжанне пастаянна кідае выклік. Ад першых слоў гімна да аб'яўленага для суседзяў бязвізу, ад канцэпцыі міжнароднай палітыкі да пастаянных заяў Прэзідэнта — усё падкрэслівае наша міралюбства. А яшчэ прагу да самастойнага жыцця пад нашым сонцам на нашай зямлі. А колькі разоў не заглядвала сонейка ўваконца беларускай хаты, зацемненае дымам вайны. Але заўжды прадзіраліся скрозь цемру і выжывалі. Цаной вялікіх ахвяр. Але ж нездарма кажуць, што з самых незадзірлівых народаў вырастаюць самыя мужныя нацыі.

Існуе меркаванне ў некаторай часткі інтэлігенцыі, «прагрэсіўных» гісторыкаў і эстэтаў экспертнай супольнасці: маўляў, сышоў тэрмін даўнасці. Не трэба палохаць моладзь фактамі генацыду... (Я ўяўляю, як бы на заклік забыцца аб Халакосце адрэагавалі яўрэі.) Давайце шчыра: да нядаўняга часу ў разы больш прадстаўнікоў сталічнага «бамонду» наведвала «Акрапаліс» (гандлёвы цэнтр у Вільнюсе), чым Хатынь...

Мір расслабляе. Але, каб яго захаваць, трэба памятаць цану, якую заплацілі ўсяго два пакаленні назад. Калі мы навучымся сябе паважаць? А ці ўпэўнены мы ў тым, што кожны юны беларус ведае пра Хатынь? А ці шмат дарослых беларусаў бачылі ў новым музеі калыску, унутры якой — макет Хатыні?.. Добра, а ці многія назавуць спаленую беларускую вёску, дзе знішчылі людзей у 12 разоў больш, чым у Хатыні? ...Ала ў Светлагорскім раёне. Тут нацысты па-зверску забілі 1758 чалавек, амаль тысяча з якіх — дзеці.

У Еўропе нацысты паводзілі сябе цывілізавана. А на нашай тэрыторыі адразу не цырымоніліся. А што рабіць з «недачалавекамі»: гвалтаваць, рабаваць, забіваць. Прычым самымі жудаснымі метадамі. У Германію вывозілі ўсё, што маглі, — ад людзей да каштоўнасцяў.

Вось таму нашчадкі тых, хто тварыў гэты жах, і хочуць зруйнаваць памяць разам з помнікамі. Вось таму, каб такога больш ніколі не паўтарылася, мы павінны зберагчы памяць аб Вялікай Айчыннай і аб Вялікай Перамозе — нашай Перамозе. Абавязкова. Інакш — нябыт.

Памятаеце, як вобразна паэт апісаў трагедыю нашага народа. Кожнае скалечанае дрэва — то сімвал нашага чалавека. Дрэва можна параніць, загубіць, але пакуль карэнні жывыя — будзе новае жыццё. Праб'ецца скрозь зямлю, пацягнецца да сонца. То ж пра нас — беларусаў.

Пакуль з пакалення ў пакаленне перадаём сваё — будзе будучыня. Пакуль захоўваем памяць, пакуль шануем традыцыі продкаў — невычэрпную крыніцу нашага народа. Яе намагаюцца запэцкаць, заваліць брудам сённяшняга часу. Марна.

Давайце паразважаем. Менавіта традыцыі — а гэта павага да бацькоў, да старых і дарослых, да Куццi і пагосту, да Каляд і да земляробчага календара, уменне мірна жыць з суседзямі, не зважаючы, у які храм яны ходзяць, прыходзіць на дапамогу тым, хто трапіў у бяду, — дапамаглі выжыць і адбіць і крывыя шаблі татара-манголаў, і цяжкія мячы крыжакоў. Нас у нашу родненькую зямельку ўтоптвалі колы шведскіх абозаў, капыты французскіх драгунаў, гусеніцы «цывілізаваных» арыйцаў. Марна. Беларусы выжылі і засталіся беларусамі. Таму нашы ворагі сёння атакуюць менавіта нашы традыцыі, расхвальваючы на ўсе лады чужыя «сапраўдныя каштоўнасці», ганьбячы нашы, якія насамрэч сапраўдныя. І тут нам галоўнае — самім не збіцца, не параблытаць. Каб былі арыенціры — Каб было дакладнае ўяўленне, кім і чым мы ганарымся, пра каго і пра што памятаем. Бо хапае, асабліва ў моладзі, сучасных неспадзяванак, а калі яшчэ неразбярыха ў трактоўцы гістарычных падзей? У руках заўжды гаджэт — такі час. А ён і выхавацель, і дарадца, і сябар... Калі не прапануем іншага — больш трывалага, надзейнага, пераканаўчага.

Нездарма кіраўнік краіны заўжды гаворыць пра неабходнасць як мага больш паспець вырашыць розных цяжкіх пытанняў. Каб новым пакаленням было зручней. Але тыя ж пакаленні павінны быць і самі гатовы быць і сейбітамі, і аратымі, і воінамі. А для гэтага трэба дайсці да кожнага сэрца. Шлях той цяжкі — па звілістых сцяжынках віртуальных інтарэсаў, праз дрыгву глабалісцкай прывабнасці. Але калі не мы, то нашых дзяцей выхаваюць іншыя. Трэба ва ўсіх сэнсах займацца будучыняй. Каб не страціць Спадчыну і захаваць Айчыну.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# КАЛІ ДЗЯСЯТЫ АЎКЦЫЁН АКАЗВАЕЦЦА РЭЗУЛЬТАТЫЎНЫМ



Надзея СТРАЛЬЦОВА, Валерыя ДУБІНА, Эма БОКАЧ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Гаспадыня «Кантынента» Эма БОКАЧ** расказала, што іх салон тут працуе ўжо чвэрць стагоддзя. Дваццаць гадоў памяшканне арандавалі, потым выкупілі першую палову паверха, а ў 2021 годзе — другую палову. «Увесь час сюды ўкладваліся сродкі, — гаворыць Эма Аляксееўна. — Але ж любы арандатар па зразумелых прычынах стараецца аддаваць перавагу касметычнаму рамонту. А вось калі памяшканне становіцца сваім, тады не лічышся з капіталаўкладаннямі. Будынак стары, інвестыцый запатрабавалі сістэмы вода-, энерга-, цеплазабеспячэння. Ну і знешні выгляд падтрымліваем, стараемся адпавядаць». У «Кантыненце» цяпер працуе 50 чалавек, гэта адзін з самых вялікіх у краіне салонаў прыгажосці, яго плошча складае 300 квадратных метраў.

Гідам па фітнес-клубе, якім валодае прыватнае прадпрыемства «МІА-Інвест», выступіла **памочнік яго дырэктара Валерыя ДУБІНА.** Яна расказала, што залы клуба займаюць другі, трэці і цокальны паверхі будынка. Тут размяшчаюцца не толькі трэнажорныя, фітнес-залы, але і працуюць самыя разнастайныя секцыі. Ёсць дзіцячая секцыя каратэ, дзіцячая акрабатыка, шэраг дарослых секцый, нават група, якая займаецца боксам. Заняткі і трэніроўкі для выхаванцаў праводзіць таксама мадэльнае агенцтва. Карыстальнікаў мабільнага дадатку клуба налічваецца 6200 чалавек, значыць, прыкладна столькі ж атрымліваюць паслугі ўстановы. Клуб працуе з сямі раніцы да 23 гадзін.

— Гэта проста цудоўна, што ў гістарычнай частцы горада паявіўся аб'ект, які служыць справе здароўя і прыгажосці, — падсумавала сустрэчу Надзея Стральцова. — Яшчэ вялікая ўдача, што новыя гаспадары карэнным чынам палепшылі знешні выгляд будынка, а ўнутры рамонт зрабілі ў адзіным стылі, нават захаваўшы элементы аўтэнтычнай цаглянай кладкі. Адным словам, прыемна ўсведамляць вынікі сваёй работы, гледзячы на падобныя комплексы сацыяльна-бытавога прызначэння ды іншыя патрэбныя людзям установы.

## Меры на павышэнне эфектыўнасці

— Каб працэс прыцягнення ў гаспадарчы абарот камунальнай уласнасці ішоў больш актыўна, у вобласці ўстаноўлены сціслыя тэрміны падрыхтоўкі дакументаў для продажу аб'ектаў і выстаўлення іх на таргі, — гаворыць далей Надзея Мікалаеўна. — Такі падыход дазваляе да канца года правесці поўны цыкл аўкцыёнаў з усімі этапамі зніжэння цаны продажу, і за базавую велічыню, і не аднойчы. Створаны алгарытм узаемадзеяння гаррайвыканкамаў і службаў камітэта. У выніку да 1 ліпеня мінулага года былі арганізаваны аўкцыёны па продажы ўсіх запланаваных аб'ектаў. Акрамя таго, не ўпускаліся з-пад кантролю аб'екты, вызваленыя на працягу года, якія згодна з заканадаўствам не падлягаюць уключэнню ў графік. Аператыўна, не больш чым за месяц, мы вызначалі спосаб прыцягнення ў далейшы абарот і тэрміны наступных работ з аб'ектам. Скажам, закрылі ў нейкай вёсцы ФАП альбо сельскі клуб, згодна з законам першы год ён не ўключаецца ў пералік аб'ектаў на продаж, але мы адразу бяром на заметку будынак і на наступны год без прамаруджання ўключаем яго ў работу.

Прыняты яшчэ шэраг мер, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці работы. Як вынік, па аб'ектах, работа з якімі залежыць ад дзеянняў мясцовых органаў улады, мерапрыемствы рэалізаваныя ў поўным аб'ёме. А дакладней, тры аб'екты бязвыплатна перададзеныя ў прыватную ўласнасць, на 11-ці аднаўлена карыстанне ў асабістых мэтах камунальнымі юрыдычнымі асобамі, 77 — ліквідаваны. Акрамя таго, здадзена ў арэнду і перададзена ў бязвыплатнае карыстанне 10 аб'ектаў, прададзена — 74. Усяго адпрацавана 175 аб'ектаў. Дарэчы, летась ад продажу камунальнай маёмасці мясцовыя бюджэты папоўніліся на 3,8 мільёна рублёў.

***— Але ж не ўсе аб'екты прадаюцца?***

— На жаль, гэта так. Крыху больш за чвэрць не ўдалося рэалізаваць. Не знайшліся пакупнікі на 28 аб'ектаў камунальнай маёмасці. Хоць кожны з іх таргаваўся з паэтапным зніжэннем кошту (мінус 50 % ад першапачатковай цаны, затым мінус 80 % і за адну базавую велічыню). У асноўным гэта аб'екты сацыяльна-культурнага прызначэння. У іх ліку — сем дзіцячых садкоў і школ, шэсць сельскіх дамоў культуры, чатыры фельчарска-акушэрскія пункты, тры лазні. Летась на кожны з іх у сярэднім прыйшлося па 4,5 аўкцыёна, і ўсё роўна прадаць не ўдалося.

## Калі прадаць не атрымліваецца

***— І які іх далейшы лёс?***

— У вобласці дзейнічае рабочая група па праблемных пытаннях прыцягнення ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца альбо выкарыстоўваецца неэфектыўна. У снежні група правяла пасяджэнне і вырашыла далейшы лёс вышэйназваных аб'ектаў. Палову з іх рэкамендавана працягваць рэалізоўваць на таргах. А вось другая палова знаходзіцца ў мясцовасці, неперспектыўнай для прадпрымальніцтва, і цягам некалькіх гадоў ніхто не праявіў інтарэс, таму яны прапанаваны пад знос. Але апошняе — не прысуд.

У інфармацыйных крыніцах размяшчаюцца звесткі аб магчымасці іх адчужэння. На працягу года па іх праводзіцца не менш за два кантрольныя аўкцыёны. Напрыклад, за папярэднія тры гады з такога пераліку прададзены 21 аб'ект плошчай 10,8 тысячы квадратных метраў.

Быў выпадак, калі пасля дзевяці няўдалых спроб прадаць безнадзейныя пабудовы за адну базавую, былі намечаны іх знос. На дзясяты, апошні, аўкцыён ніхто асабліва не спадзяваўся, а ён аказаўся рэзультатыўным. Так што шанц не адправіць будынак пад бульдозер застаецца да апошняга. Дарэчы, цяпер у пераліку, размешчаным на сайце аблвыканкама, 37 таых аб'ектаў.

***— Калі закрануць тэму работы на перспектыву, цікава даведацца, як складваецца сёння сітуацыя з аб'ектамі камунальнай уласнасці, прыцягнутымі ў гаспадарчы абарот у папярэднія гады, скажам, у 2021—2022-і?***

— За ўказаны перыяд было ўведзена ў эксплуатацыю пасля рэканструкцыі, капітальнага рамонту альбо перапрафілявання рэалізаваных на таргах і бязвыплатна 224 аб'екты камунальнай маёмасці. Амаль дзве трэці з іх выкарыстоўваюцца. У тым ліку 92 сталі пляцоўкамі для прадпрымальніцкай дзейнасці, 37 будынкаў выкарыстоўваюцца фізічнымі асобамі для жылля і вядзення падсобнай гаспадаркі, 12 служаць дзяржаўным установам, у адной размясцілася грамадская арганізацыя. У названыя аб'екты ўкладзена 3,5 мільёна рублёў інвестыцый. Там створана 200 рабочых месцаў.

Яшчэ 56 аб'ектаў знаходзяцца ў стадыі падрыхтоўкі да выкарыстання, вядуцца будаўнічыя работы, два знесены, і падрыхтаваны пляцоўкі для новых пабудоў, два перавезены на новыя ўчасткі. Такім чынам, больш за 90 працэнтаў аб'ектаў атрымалі альбо атрымліваюць новае жыццё.

## Аўкцыён, што працягваўся 16 гадзін

***— У якіх раёнах летась найбольш паспяхова прадавалася маёмасць? Ці здараліся асабліва цікавыя, адметныя таргі?***

— Летась лідарам па продажах стаў Ганцавіцкі раён. Там рэалізавана 15 аб'ектаў нерухомасці. Добра прадавалася маёмасць і ў абласным цэнтры. Тут было прапанавана сем аб'ектаў, і ўсе яны пайшлі з малатка. Праўда, найбольш рэзультатыўнымі сталі снежаньскія аўкцыёны. Патэнцыяльныя пакупнікі будынкаў са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці, як выглядае, чакалі да апошняга. І вось 26 снежня на таргах з пачатковым коштам у адну базавую будынкі былі прададзены. Але ў выніку якой барацьбы!



Фітнес-клуб «Мфіт».

Аўкцыён па продажы будынка па вуліцы Брэсцкіх дывізій працягваўся 16 гадзін, у таргах удзельнічалі 15 прэтэндэнтаў. Цана з базавай узрасла больш чым у 9,5 тысячы разоў і склала 352,6 тысячы рублёў.

Па цане, павялічанай чатырма ўдзельнікамі таргоў амаль у 150 разоў, прададзена абарончая казарма «Ж-З» плошчай 353,8 квадратных метра. Будынак уваходзіць у склад комплекснай матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Сістэма фортаў у складзе фартыфікацыйных пабудоў Брэсцкай крэпасці». Казарму купілі за 5,5 тысячы рублёў.

***— Прыкладаў сучасных, цікавых, крэатыўных спосабаў надання новага жыцця старым пабудовам у Брэсцкай вобласці шмат. Што на слыху з самых апошніх?***

— Такіх сапраўды нямала. Кафейня «Таполі» ў Брэсце па вуліцы 17 верасня ў будынку 1928 года — гэта прыклад сапраўднай любові да сваёй справы: інтэр'ер, атмасфера, нават прыгожая беларуская назва абуджаюць цікавасць. Прыемна чытаць добрыя водгукі ў інтэрнэце пра базу адпачынку «Хаткі» і сядзібу «Добры бор» у Баранавіцкім раёне, якія ўзніклі ў выніку продажу маёмасці. Як і пра «Панскі хутар» на Ганцаўшчыне, што раней быў комплексам будынкаў райпалівазбыту 1960 года пабудовы. Новы гаспадар купіў аб'ект у жніўні 2022 года. У сціслыя тэрміны правёў рэканструкцыю. Цяпер там ёсць жылы дом для сям'і гаспадара, жылыя памяшканні для турыстаў, банкетная зала.

А ў Ніжнім Церабяжове Столінскага раёна прадалі старую лазню. Новы гаспадар таксама абсталяваў лазню, толькі з новым каларытам, новым начыннем і новай якасцю абслугоўвання. Лазня і выглядае стыльна, і карыстаецца попытам у кліентаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і абласнога камітэта дзяржмаёмасці.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Эквадоры затрымалі звыш 4,6 тысячы чалавек пасля пачатку беспарадкаў



Паліцыя і ўзброеныя сілы Эквадора затрымалі 4680 падазраваных пасля пачатку ўзброеных беспарадкаў, выкліканых бунтамі ў турмах у пачатку студзеня. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на паліцыю краіны. Больш за 57 тысяч супрацоўнікаў праваахоўных органаў удзельнічалі ў аперацыях па супрацьдзеянні злачыннасці, падчас якіх было канфіскавана звыш 1,5 тысячы адзінак агнястрэльнай зброі, каля 8,3 тысячы выбуховых прыстасаванняў і больш за 40 тон наркатычных рэчываў. Колькасць вызваленых з заложнікаў супрацоўнікаў паліцыі і папраўчых устаноў перавышае 200 чалавек. Як вядома, сітуацыя ў сферы бяспекі ў Эквадоры абвастрылася 7 студзеня пасля ўцёкаў з турмы верхавода банды «Лос-Чонерас» па мянушцы Фіта. Пасля гэтага ў некалькіх пенітэнцыярных установах краіны адбыліся бунты. Прэзідэнт Даніэль Набоа абвясціў у краіне надзвычайнае становішча і ўвёў каменданцкую гадзіну.

## Тры чвэрці французаў лічаць падаткі ў краіне занадта высокімі



Паводле вынікаў апытання, праведзенага падліковай палатай Францыі, тры чвэрці французаў лічаць падаткі ў краіне занадта высокімі. Пра гэта паведамляюць РІА «Новости» са спасылкай на французскую газету Le Figaro. У выданні нагадалі, што, паводле даных Нацыянальнага інстытута статыстыкі і эканамічных даследаванняў Францыі, узровень падатковага цяжару ў краіне ў 2022 годзе склаў 45,4 працэнта ВУП. Паводле інфармацыі Le Figaro, французаў таксама не задавальняе вялікая колькасць падаткаў, якія ім даводзіцца плаціць. Акрамя таго, 67 працэнтаў выказваюць незадаволенасць тым, як выдаткоўваюцца дзяржаўныя сродкі. Больш за палову (63 працэнты) жыхароў краіны не давяраюць Еўрасаюзу ў справе выкарыстання ім сабраных праз падаткі сродкаў, а французскай дзяржаве ў гэтым жа пытанні не давяраюць 68 працэнтаў апытаных.

## Экологі занепакоены спускам на ваду найбуйнейшага ў свеце круізнага лайнера



Самы вялікі ў свеце круізны лайнер, памерам амаль чатыры гарадскія кварталы, днямі адправіўся ў сваё першае плаванне ад берагоў Маямі, паведаміла выданне CBC. «Ікона мораў» (Icon of the Seas) абсталявана шасцю двухпаліўнымі рухавікамі, можа працаваць на звадкаваным прыродным газе (ЗПГ), альтэрнатыўным паліве, якое, на думку Міжнароднай асацыяцыі круізных ліній, зніжае выкіды серы і парніковых газаў. Аднак навукоўцы выказваюць вялікія апасенні, што такія судны, якія працуюць на ЗПГ, значна павялічваюць выкіды метану ў атмасферу, больш за тое, падчас круізу адпачывальнікі выдзяляюць у 8 разоў больш вуглякіслага газу, чым на сушы. Icon of the Seas падзелены на восем кварталаў на 20 палубах. На караблі шэсць водных горак, сем басейнаў, лядовы каток, тэатр, а таксама больш за 40 рэстаранаў і бараў. Судна пры максімальнай ёмістасці можа перавозіць да 7,6 тысячы пасажыраў і 2,3 тысячы чалавек персаналу.

Сямейная газета

Выпуск № 2 (227)

# НЕ ПАЗБАЎЛЯЙЦЕ «КРЫВІНАЧКУ» ВЫБАРУ



*ПРЫЯЦЕЛЬКА распавяла гісторыю пра тое, як яна паехала ў камандзіроўку, а сына пакінула з мужам. «Вусаты нянь» увесь вечар гуляў з малым, а потым, стаміўшыся, вырашыў уключыць яму за паўгадзіны да сну мульцік. Сам жа тым часам прылёг адпачыць. Калі мужчына прачнуўся, на гадзінніку было а палове трэцяй ночы. Увесь гэты час, больш як чатыры гадзіны (!), шасцігадовы хлопчык прасядзеў, не адрываючы погляду ад экрана. Прыведзены прыклад яскрава ілюструе, што маленькія дзеці губляюць адчуванне часу, калі да іх у рукі трапляюць гаджэты. І гэта цалкам фізіялагічна, бо сіла волі пачынае фарміравацца толькі з сямі гадоў...*

*Яшчэ калі я вучылася на журфаку, ад старшакурсніцкаў пачула гісторыю пра Толіка. Ён «праславіўся» тым, што прапускаў пары, бо начамі сядзеў перад маніторам і гуляў у «Танчыкі». А раніцай адсыпаўся. І так паўтаралася дзень за днём, пакуль маці, западозрыўшы нядобрае, сама не прыехала ў студэнцкі інтэрнат і не ўбачыла ўсё на ўласныя вочы. Прыйшлося забіраць сына дадому, браць акадэмічны адпачынак ад вучобы, праходзіць лячэнне ад гульнямані... Як склаўся лёс таго Толіка, гісторыя замоўчвае. Але відавочна адно: каб не страціць дзіця ў віртуальным свеце, бацькам з самага нараджэння трэба браць на сябе адказнасць і кантраляваць экранны час сваіх крывінак.*

*У мяне ёсць некалькі знаёмых, якія скардзяцца, што іх дочкі-сыночкі — малаежкі. Каб іх накарміць, уся сям'я па некалькі разоў на дзень ладзіць вакол малых ледзь ці не танцы з бубнам. Чаго яны толькі не робяць, каб дзіця паела: і песні спяваюць, і гісторыі расказваюць, і мульцікі ўключаюць. Што датычыцца апошніх, то нядаўна мама дваіх дачушак, біёлаг па адукацыі, на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках напісала пост пра тое, наколькі шкодна карміць дзіця «пад мульцікі». «У будучыні гэта пагражае пераяданнем і атлусценнем, расстройствам харчовых паводзінаў, шантажом і маніпуляцыяй ежай. Важна старацца не карміць дзяцей пад мульцікі. Калі малеча не хоча есці нармальную ежу, то першы крок: мама садзіцца за стол пры дзіцяці і есць сама. Ваш сын (дачка) гэта бачыць і з часам пачне пераймаць. Пад мульцікі ж дзіця будзе адкрываць рот, нават калі паднесці пустую лыжку. Гэта прыкмета таго, што яно паглынае ежу бессвядома, «на аўтамаце». Трэба паступова сыходзіць ад гэтага, калі не хочаце вялікіх праблем у 5-6 гадоў».*

*Калі шчыра, не разумею бацькоў, якія даюць свой смартфон дзіцяці ледзь не з самага нараджэння. Маўляў, «гэта ж час такі, без гаджэтаў сёння ніяк». А потым здзіўляюцца, калі ў тры гады сын сумуе без мульцікаў ці ролікаў на YouTube. Любы псіхолаг скажа, што калі ў 5-6 гадоў дзіця можа заняць сябе толькі мульцікам — гэта трагедыя. Здольнасць сябе забаўляць, прыдумваць гульні, фантазіраваць — вельмі важны навык. І ён атрафіруецца, калі ў дзіцяці ёсць лёгкая і даступная альтэрнатыва ў выглядзе тыцкання пальцам у экран. Больш за тое, псіхолагі раяць да трох гадоў выключыць любыя гаджэты, бо ў дзіцяці ў іх няма патрэбы. А прывыканне і залежнасць і ў такім узросце развіваюцца вельмі хутка.*

*Нядаўна адна шматдзетная маці падзялілася, што яны з мужам падарылі 7-гадоваму сыну смартфон. Адразу ж усталявалі на яго дадатак «Бацькоўскі кантроль». Таму хлопчык можа толькі гадзіну ў дзень глядзець мульцікі ды гуляць у гульні, а потым усё блакіруецца, акрамя званкоў і дадатку па вывучэнні замежнай мовы. «Мы, бацькі, проста абавязаныя ствараць сваім крывінкам хоць бы магчымасць выбару розных інтарэсаў і заняткаў, — кажа Каця. — Бо калі пакінуць бескантрольна гаджэты, гэта пазбавіць дзяцей выбару і пакіне ім толькі гаджэты». Я згодна з Кацяй, што задача бацькоў — паказаць, што рэальнае жыццё цікавейшае за віртуальнае. Разам гуляць у настолкі, чытаць, дурэць, майстраваць, клеіць, маляваць, гатаваць, прыбіраць, бегаць... І гэта спачатку зусім не пра эканомію бацькоўскага часу і ўвагі. А хутчэй наадварот. Эканомія пачынаецца пазней, бо дзеці, асвоіўшы калейдаскоп розных заняткаў, зусёды змогуць заняць сябе самі і цудоўна ўзаемадзейнічаюць з іншымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі.*

*І яшчэ: практыкуйце, калі пакуль гэтага не робіце, «правіла першых трох хвілін» у адносінах з дзіцем. Праверана — яно сапраўды цудадзейнае. У ім няма нічога складанага. Проста забіраючы дзіця з садка ці ад бабулі, схавайце мабільны тэлефон, прысядзьце на ўзровень яго вачэй, абдыміце і скажыце, як вы па ім сумавалі. Радуйцеся так, як быццам сустракаеце сябра, якога не бачылі ўжо шмат гадоў. Бо, як правіла, у першыя хвіліны сустрэчы малеча «выдае» самае галоўнае — што асабліва ўразіла за дзень. Менавіта таму вельмі важна і не ўпусціць гэты момант, штодня па цаглінцы будаваць даверлівыя адносіны і эмацыйную блізкасць са сваімі дзецьмі.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Тыя, хто побач

# Пяць любімых жанчын Эдуарда Карпюка

## Сям'я рэканструктараў і пошукавікаў — пра агульнае захапленне, пашану да Пятра Машэрава і дамашні музей



**МАГІЛЯЎЧАНІНУ Эдуарду Карпюку невымоўна пашчасціла. У яго сям'і аж пяцёра дзяўчат — любімая жонка і чатыры дачкі. А ў адносінах такая ідылія, што, паназіраўшы за імі збоку, магу з усёй адказнасцю сказаць: яны неверагодна шчаслівыя.**

### ЭДУАРД + НАТАЛЛЯ

На пытанне: «Як пазнаёміліся?» — Наталля адказвае сціпла: «Сам прыйшоў». Насамрэч гэта была лёсаўтваральная сустрэча, разам яны ўжо 27 гадоў. Сёлета будуць адзначаць дату пад знакам чырвонага дрэва. Гэта сімвал высакароднасці, мудрасці, моцы і трываласці адносін. Так яно і ёсць. Сужэнцы кажуць, што адно без аднаго сябе не ўяўляюць. Хоць, бывае, і спрачаюцца. Але праз 10 хвілін ізноў разам. Такога, каб не размаўлялі суткамі, няма.

— У нас як у прымаўцы: каханыя сварацца — толькі цешацца, — смяюцца яны.

Наталля расказвае, што, як толькі ўбачыла Эдуарда, зразумела: яе лёс. І дзяўчат-суседак па інтэрнаце, калі тыя заглядваліся на хлопца, папярэдзіла: нават не думайце, гэта мой! Тыя ж апраўдваліся, маўляў, спадзяваліся, што брат. А яны і сапраўды чымсьці знешне падобныя.

— Я тады на абутковай фабрыцы працавала, жыла ў інтэрнаце, — успамінае Наталля. — Калі ён папрасіў мяне паклікаць суседа да выхаду, нешта падказала мне, што сустрэча наша невыпадковая. Наступным разам ён прыйшоў ужо да мяне.

— Я тады ў арміі тэрміновую праходзіў, атрымаў звальненне, — дадае Эдуард. — Завітаў да сябра, а знайшоў... сваю другую палавінку. Пасля дэмабілізацыі да яе прыйшоў, а хутка і ажаніліся.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

А вы ведалі?

# ПРЫБОРКА БЕЗ ЛЯНОТЫ І КАПРЫЗАЎ

## Як навучыць дзіця наводзіць парадак



**ЦЯЖКА знайсці дзіця, у пакоі якога заўсёды чыста. Найчасцей за ўсё, наадварот, бацькі прыкладаюць шмат намаганняў, каб прымусіць малых сабраць цацкі, пакласці ў шафу вопратку і адправіць у сметнік розныя паперкі і абгорткі з-пад цукерак. Хтосьці пагражае аддаць дзіця «нядобраму дзядзьку», хтосьці ідзе на ўлагоджванні накшталт «вось навядзеш парадак, а я табе прысмакі куплю». Здаецца, простыя выхады з сітуацыі. Аднак ці дастаткова іх?**

### Тры памылкі

Насамрэч метад «бізуна і перніка» ў дадзеным выпадку тактыка неадназначная, бо і той, і другі маюць непажаданыя наступствы. Запалохванні і пагрозы, напрыклад, — шлях да парванай упэўненасці ў будучыні. Мама і тата — апора дзіцяці, крыніца любові, цеплыні, увагі, даверу. І тут раптам атрымліваецца, што ў любы момант нейкая злая сіла можа разлучыць яго з бацькамі, пакінуць сам-насам з незразумелым варожым светам. А калі гэта інфармацыя яшчэ і гучыць ад блізкіх?.. Гарантаваныя кашмары, сумненні ў сваёй неабходнасці для сям'і, розныя комплексы — чым меншыя па ўзросце дзеці, тым больш глабальная псіхаэмацыянальная катастрофа і яе наступствы.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)*

# ШТО ВЫРОШЧВАЮЦЬ «САДОЎНІКІ» АД ГЕНЕАЛОГІІ,

## або Заняткі па радаводзе



**АДНОЙЧЫ настане дзень, калі пасля гары прачытаных кніг самым захапляльным раманам на свеце, самай цікавай дакументальнай аповесцю, з якой захочацца даведацца пра ўсіх сваіх продкаў, стане гісторыя твайго роду. І неадольна пацягне паглыбіцца ў яе настолькі, наколькі дазволяць уласныя здольнасці да пошуку. Самыя нязначныя звесткі, даты, імёны, прозвішчы ў гэтай кнізе набудуць для цябе неацэнны сэнс.**

**Сёння ж паспрабуем намаляваць сваё першае дрэва. Але спачатку вырашым, па якой методыцы будзем яго ствараць: па ўзыходзячай ці сыходзячай лініі? Высветлім, якіх сваякоў уключаць — толькі прамых ці яшчэ і пабочных? Пры гэтым будзем намагацца рабіць складанае цікавым і простым!**




№ 1. Шаблон дрэва па ўзыходзячай лініі.



№ 2. Дрэва ільм шурпаты на фоне палаца Гутэн-Чапскіх. Фотаздымак зроблены ў 1954 годзе і быў перададзены Алегу Маслееву ў 2012 годзе Эстрыніным і Аксёнавай, якія ў маладыя гады жылі ў Станькаве. Фотаздымак з гістарычнага блога czapski.by

### ДАГАРЫ НАГАМІ — ВЫ ЎСУР'ЁЗ?..

Ёсць два варыянты складання генеалагічнага дрэва.

Узыходзячае будуецца ад нашчадка да продкаў. Унізе, каля каранёў, у якасці пачатковага элемента схемы выступае складальнік радаводу, умоўнае «Я», напрыклад, вы самі ці ваш сын, а можа, унучка *(малюнак № 1)*. Такі спосаб зручны для тых, хто толькі пачаў вывучэнне сваёй сям'і. Пачатковец валодае інфармацыяй у асноўным аб сваіх найбліжэйшых сваяках: бацьках, дзядулях, бабулях, прадзядулях, прабабулях... — і паступова паглыбляецца ў мінулае. Калі вы збіраецеся, напрыклад, падарыць свайму дзіцяці першая родавае дрэва, каб зацікавіць яго ўласным паходжаннем, то «вырошчванне» па ўзыходзячай лініі — выдатны варыянт: на такім малюнку малому будзе ўсё наглядна бачна і зразумела.

Сыходзячае дрэва мае супрацьлеглы напрамак. У гэтым варыянце каля каранёў адлюстроўваюць першага з вядомых нам продкаў, самага далёкага ў часе ад нас, ён і будзе вашым родапачынальнікам. Зразумела, побач з ім павінна знаходзіцца яго жонка — калі вам пашанцуе адшукаць аб ёй звесткі, але тут існуюць, на жаль, пэўныя складанасці, аб якіх пагаворым ніжэй. Каб пабудаваць дрэва па сыходзячай лініі, трэба валодаць даволі вялікімі ведамі аб сваяках. Між іншым, такі варыянт выглядае больш натуральным з пункту гледжання законаў прыроды. Ад трывалых каранёў — продкаў — уздымаецца ўвысь ствол з пышнай кронай — іх нашчадкі. А ў выпадку з узыходзячай схемай дрэва расце быццам дагары нагамі: ад нашчадкаў да продкаў. Аднак не буду нікога запэўніваць, што такіх незвычайных дрэў у раслінным свеце не сустракаецца. Бо яны... сапраўды існуюць! І зараз убачым таму гістарычна-батанічнае пацвярджэнне.

### ПРА ВЯЗЫ, ВІКІНГАЎ І ГУТЭН-ЧАПСКІХ

У старым графскім парку каля сядзібы Гутэн-Чапскіх у Станькаве яшчэ нядаўна стаяла дрэва 130-гадовага ўзросту з загадкавай назвай: ільм горны «Кампердоўні» (Ulmus glabra «Camperdownii»), прасцей кажучы, вяз голы, ці шурпаты. Цікава, што з-за яго гібрыднай шырока-плакучай формы ў выглядзе парасона, пры якой асноўныя галіны растуць вертыкальна ўніз і з часам пачынаюць звісаць аж да самай зямлі, у народзе хадзілі ўпартыя чуткі, што гэта дрэва было пасаджана каранямі ўверх. Разбівалася паркавая кампазіцыя па загадзе Эмірыка фон Гутэн-Чапскага ў 1864 годзе. І восць адно з трох дрэў жыло-зелянела аж да 1994 года. А потым высахла і ў 2004-м знікла зусім *(фотаздымак № 2)*.

Малодшы сын Эмерыка Чапскага — Георгій (Ежы) Эмерыкавіч у XIX стагоддзі і да 1917 года быў уладальнікам роднай вёскі майго мужа — у Валодзькаў Станькаўскай воласці (цяпер Уздзенскі раён), а за некалькі кіламетраў ад яе знаходзіліся маёнтак Каралёва і лясная дача Георгія Чапскага. І вось на тых лясных абшарах аднойчы ўзнікла паміж сялянамі наваколля і графам Георгіем Чапскім вялікая шматгадовая спрэчка з-за... пасадкі 120 тысяч саджанцаў яго леснікамі на абцяжараных сялянскім сервітутам землях. І ўсё адбывалася як у вострасюжэтным рамане. Аб гэтай цяжбе я даведалася выпадкова, падчас таго ж няспыннага пошуку каранёў. І, гартаючы пажаўцелыя старонкі найцікавейшых арыгіналаў архіўных судовых спраў за 1874—1911 гады, была ўражана, колькі яшчэ таямніц нам прызначана адкрыць на гэтым шляху...

Аднак, калі вернемся да нашага батанічнага пошуку дрэў, якія былі пасаджаны літаральна дагары нагамі, то сустрэнем і бясспрэчныя таму пацвярджэнні.

У расійскай вёсцы Белагорцы Гатчынскага раёна Ленінградскай вобласці, у закінутай сядзібе купца Елісеева захаваліся дзве алеі стагадовых з лішкам ліп, пасаджаных менавіта такім чынам — дагары нагамі — у 1911 годзе. Дарослая алея з часам ператварылася ва ўражвальны прыгожы тунэль. Але цяпер пакінутыя без догляду засмучаныя дрэвы перажываюць занепад.

Аб гэтай інфармацыі я даведалася ад бабулі маёй нявесткі — кандыдата сельскагаспадарчых навук Лідзіі Якаўлеўны Паляковай, якая там жыве і працавала з 1967 года ў Навукова-даследчым інстытуце сельскай гаспадаркі ў Белагорцы, займаючыся насенняводствам шматгадовых траў.

Дарэчы, першымі апрабавалі такі спосаб пасадкі «дагары нагамі» на нізкарослай карлікавай бярозе старажытныя вікінгі. Саджанцы выкопвалі з зямлі, падразалі галіны і карані, перакульвалі і закопвалі крону ў зямлю, пакінуўшы карані наверсе. Пры ўдалай пасадцы на каранях з'яўляліся парасткі і лісце, а ранейшыя галіны пускалі новыя карані. Гэты метад распаўсюдзіўся ў Нідэрландах, Вялікабрытаніі і іншых краінах. Дарэчы, у хвойных раслін шанц прыжыцца пры такой перасадцы зусім мізэрны — адзін з тысячы. А сярод лістападных саджанцаў выжываў кожны пяцідзясяты.

### КАБ АДЧУЦЬ АСАЛОДУ РОЗНІЦЫ

Але мы нічога не будзем рабіць дагары нагамі! Калі настроены сур'ёзна займацца сваёй генеалогіяй, то менавіта па сыходзячай лініі пабудуем родавае дрэва, як толькі набудзем дастатковыя для гэтага веды.

А зараз прапаную вам згуляць у «садоўніка» па генеалогіі. У інтэрнэце існуе шмат гатовых бясплатных шаблонаў дрэў на любы густ. Вы можаце спампаваць і раздрукаваць рамантычнае старажытнае дрэва ці забаўнае, з вясёлымі «вочкамі», якое прываблівае ваша дзіця, і яно абавязкова захоча размаляваць яго самастойна. Паспрабуйце запоўніць ячэйкі, гэта вельмі натхняе, асабліва калі рабіць разам, сям'ёй. Умова задання — пазначыць прозвішча, імя і імя па бацьку, дзявочае прозвішча жаночых асоб, дату нараджэння — як мага дакладней. Гэта будзе ваш першы тэст — адказаць самому сабе: што я ведаю цяпер? Раю захаваць гэты чарнавік, каб потым, калі пройдзеце пэўны пошукавы шлях, параўнаць свае дасягненні і адчуць асалоду розніцы.

### СІДАРЫХА, ГАЎРЫЛЬЧЫХА І АКСЕНЯ

Я таксама пачала менавіта з упадабанага раздрукаванага шаблона — вельмі не цярпелася, як выдатніцы, запоўніць усе клетачцы. Асноўныя галіны майго радаводу ўключалі з боку маці прозвішчы: Паўловіч, Баешка, Васілеўская, Прановіч; з боку бацькі — Пятрыла, Ваўпшас. І я вырашыла рабіць усё так, як патрабуе навуковая генеалогія: памясціць каля каранёў свайго родапачынальніка, памятаючы пры гэтым, што дзеці жанчыны пазначаюцца на дрэве яе мужа, а не на дрэве яе бацькоў. Але адразу ўзнікла загвоздка. Каго з родапачынальнікаў мне выбраць галоўным, калі я хачу пакінуць радавод сваім дзецям?

Па лініі майго бацькі пачынальнік роду — прадзядуля Антанас Пятрыла. Калі б я нарадзілася сынам, то захавала б яго прозвішча і перадала б дзецям. Але ў шлюбе я змяніла сваё дзявочае прозвішча, і таму абодва мае сыны на бацькоўскім дрэве Пятрылаў на правілах генеалогіі ўжо не пазначаюцца. Можа, тады мне ўнесці ў шаблон родапачынальніка па матулінай лініі — Мірона Паўловіча? Але і тут падсцерагае тая ж пастка. Калі мая маці пабралася шлюбам, то яе дзеці, то-бок мы з братам, «пераскочылі» на сямейная дрэва нашага бацькі, Віктараса Пятрылы.

Атрымліваецца нейкі парадокс: жанчына з'яўляецца прадаўжальніцай сямейнага роду, але сама пры гэтым губляе ўласнае прозвішча і быццам некуды знікае з родавага дрэва.

Вывучаць продкаў па жаночай лініі — наогул складаная справа: і ў старажытных архіўных дакументах, ды і цяпер на магільных помніках у жонкі звычайна пазначаецца толькі прозвішча яе мужа. Жанчына некалі страчвала нават сваё ўласнае імя. У вёсках існаваў звычай называць жонак па імені мужа: Сідарыха, Свірыдзіха, Гаўрыльчіха, а іх дзяцей — Гаўрыльчыкавымі, Сідарчыкавымі, Мірончыкавымі... На дзіва, мая бабуля Ксенія (Аксеня) Васільеўна Паўловіч нейкім чынам «здолела парушыць» гэтую «завядзёнку»: яе дзяцей, а сярод іх маю матулю звалі Аксенчыкавымі.

Дзякуючы таму, што я пачала шукаць сваё ўмоўнае месца на тым трэніровачным шаблоне, я зразумела дзве рэчы: асоб жаночага роду намагаецца скінуць з родавага дрэва сама выбудаваная ў адпаведных традыцыях сістэма генеалогіі, і з гэтым, напэўна, нічога не зробіш.

І калі я хачу пакінуць радавод сваім сынам (якія, спадзяюся, яны калі-небудзь працягнуць), то маім галоўным прыярытэтам становіцца дрэва майго мужа. Яго карані я павінна даследаваць не менш дасканала, чым свае, і пабудаваць радавод, пачынальнікам якога будзе Ануфрый Іонаў Жур.

Так атрымаўся пошук адразу па чатырох прозвішчах мужа: Жур—Скарына, Букаты—Сакаў. За апошнія два гады ў маёй табліцы з'явілася 176 прадстаўнікоў галіны Жур (без жонак і мужоў гэта 116 кроўных сваякоў). І цяпер я нават называю ўсіх яго продкаў — нашы.

І, безумоўна, мне нічога не замінае апантана працягваць вывучаць кожную галіну маіх уласных радаводаў. Яны, мае кроўныя, грэюць сэрца і надаюць моцы! Я мару вырасціць цэлы сад генеалагічных дрэў!

### КРОЎНЫЯ, БЛІЗКІЯ ЦІ ПАБОЧНЫЯ

Складаючы родавае дрэва, трэба вырашыць, якіх сваякоў будзем уключаць — толькі прамых ці яшчэ і іншых?

Блізкія сваякі — гэта прамыя кроўныя продкі і нашчадкі па вертыкальнай і гарызантальнай лініях. Па вертыкальнай лініі блізкімі сваякамі прызнаюцца дзеці і бацькі, бабулі, дзядулі і ўнукі. Па гарызантальнай лініі блізкімі лічацца браты і сёстры, у тым ліку і тыя, якія маюць толькі агульнага бацьку ці маці.

Пабочнымі сваякамі, нягледзячы на кроўнае далучэнне іх да блізкай радні, з'яўляюцца прабабулі і прадзядулі; праўнукі і праўнучкі; цёткі і дзядзькі; пляменнікі і пляменніцы; стрыечныя ці траюрадныя браты і сёстры.

І напрыканцы шпаргалка для тых, хто яшчэ блытае, як лічыць пакаленні ў родзе: я — першае пакаленне; бацькі — другое; дзядуля і бабуля — трэцяе...

Жадаю абавязкова дайсці нам усім не менш чым да сёмага калена!

**Ала ЖУР.**

*(Працяг будзе.)*

# Пяць любімых жанчын Эдуарда Карпюка



**Сваім хобі Эдуард захапіў усіх, за ім пацягнулася і жонка. Тэма сямейных захапленняў сур'ёзная — рэканструкцыя падзей Вялікай Айчыннай вайны. У гэтым сям'я жыве ўжо 15 гадоў.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Нават пэўны час працавалі разам, у той жа вайсковай часці, дзе Эдуард служыў. Пасля арміі ён там займаў розныя пасады. А Наталля шыла салдацкае адзенне. «Працавалі ў пары, рабілі ўсё разам, — усміхаецца Эдуард. — Без яе я не справіўся б. Яна была маёй правай рукой, такі баявы таварыш».

Першая дачка Анастасія з'явілася ў сям'і ў 1998 годзе. У 2001-м нарадзілася Валерыя, якую назвалі ў гонар бабулі. Трэцюю дачку Паліну бабуля Эдуарда папрасіла назваць у гонар жонкі Пятра Машэрава. Казала, што яна была вельмі добрай жанчынай. А вось самая малодшая — Сафія — стала падарункам да Дня маці, нарадзілася 13 кастрычніка.

— Мы вельмі хацелі дзяцей, — прызнаецца Наталля. — Я сама са шматдзетнай сям'і, нас у бацькоў было чацвёра — трое хлопцаў і я, адзіная дзяўчынка. Затое ў нашай сям'і ўсё наадварот — адзін мужчына і вунь колькі дзяўчат.

З днямі нараджэння наогул атрымалася забаўная арыфметыка, вельмі шмат супадзенняў. Эдуард нарадзіўся 17 снежня, а Наталля — 18-га таго ж месяца. Тры дачкі ў іх майскія, у Анастасіі дзень нараджэння 1 мая, а ў Валерыі і Паліны — 22 мая!

Дарослыя дочкі жывуць асобна, у іх свае сем'і. Ужо і ўнук у шчаслівых дзядулі з бабуляй ёсць. На выхаванні Эдуарда і Наталлі засталіся самыя малодшыя і пакуль яшчэ школьніцы Паліна і Софія. Дзяўчаты вельмі таленавітыя і творчыя. Поля добра малюе, вучыцца ў школе мастацтваў № 5. А Соня — музыка, іграе на домры і спявае ў хоры. Займаецца год, а ўжо робіць адчувальныя поспехі. Бацькам на Новы год выканала на народным інструменце «Елачку». Эдуард папрасіў дачку да 9 Мая вывучыць «Кацюшу».

## ТОЕ, ШТО ЯДНАЕ

Агульных інтарэсаў шмат: паходы на прыроду, тыя ж шашлыкі, грыбы, ягады. Усе любяць жывёл, і пра гэта ведаюць іх знаёмыя. Сабаку Арні падарыла Сонечцы хросная на пяцігоддзе. Вельмі ласкавы звер, любіць «цалавацца». Кошку прынесла суседка на перетрымку. Бралі на час, а затрымалася яна ў нас на 8 гадоў. Кошка з характарам, але яе любяць. Яшчэ ёсць шыншыла Мікеланджэла, або проста Мікі. Падарунак сяброў Эдуарда. Грызун яшчэ той.

Чаго няма ў сям'і, дык гэта машыны. Як жартуе Эдуард, ён па жыцці пасажыр. І жонцы забараніў вучыцца на правы. «Сказаў, што толькі на танку можна, — смяецца Наталля. — Тады ён будзе спакойны за мяне». «Машына — гэта лішні член сям'і, на якога спатрэбяцца грошы, — аргументуе Эдуард. — Тады я сваім хобі займацца не змагу. А яно вельмі дарагое». Сваім хобі Эдуард захапіў усіх, за ім пацягнулася і жонка. Тэма сямейных захапленняў сур'ёзная — рэканструкцыя падзей Вялікай Айчыннай вайны. У гэтым сям'я жыве ўжо 15 гадоў. А Эдуард — наогул з дзяцінства. У кожнага, нават у 8-гадовай Соні, ёсць воінская форма, дарэчы, не абы якая — у сталічных майстроў пашытая. А ў Паліны шыкоўная дэсантная форма з блакітнага камуфляжу. Эдуард з гонарам дадае, што гэта ўзор першай беларускай дэсантнай экіпіроўкі.

— Калі нашы дарослыя дочкі былі маленькія, мы і з імі ў рэканструкцыях удзельнічалі, нават у кіно здымаліся, — расказвае Наталля. — Напрыклад, у дакументальнай стужцы «Недзіцячы дзённік 1943 года». Нашай Паліне тады было ўсяго 2,5 года. А летась на 9 Мая ўсёй сям'ёй апрануліся па-ваеннаму і пайшлі на парад. Да нас шмат хто падыходзіў, фатаграфаваліся на памяць.



## УНУЧАТЫ ПЛЯМЕННІК ПЯТРА МАШЭРАВА

Цікавасць да вайны ў Эдуарда спадчынная. Ён унучаты пляменнік Пятра Машэрава, які падчас вайны быў камандзірам партызанскага атрада. Партрэт Машэрава вісіць на ганаровым месцы ў зале. Бабуля Эдуарда — Валерыя Арсенцьеўна Врагава — сваячка Пятра Міронавіча.

— Мне было 4 гадзікі, калі ён загінуў, — расказвае Эдуард. — У сямейным архіве ёсць фота, дзе Пётр Машэраў мяне на каленях трымае. У бабуліных сясцёр былі фота, дзе ён мяне на каленях трымаў. Бабуля была малалетнім вязнем, яе ў Германію ганялі. Яна рана пайшла на пенсію і даглядала мяне. Я быў першы ўнук. Пра Машэрава шмат расказвала. Я яшчэ застаў сясцёр Пятра Міронавіча. Бабуля вазіла мяне ў Мінск да бабуль Лёлі і Галі, а таксама ў Віцебск — да бабулі Матроны. У 80-я гады мы ўсіх аб'ездзілі. Пакуль маці заканчвала інстытуты, мы з бабуляй падарожнічалі.

Летась да Карпюкоў завітала дэлегацыя з Віцебскага дзяржуніверсітэта імя П. Машэрава ў сувязі са 105-гадовым юбілеем вядомага палітычнага дзеяча. Яны даведаліся пра Эдуарда праз Магілёўскі музей гісторыі горада. Эдуард з прыяцелем пераапрануліся ў ваенную форму былых савецкіх часоў і выйшлі іх сустракаць. Вось сюрпрыз быў!.. Потым Эдуард віцяблянам славутыя мясціны роднага Магілёва паказаў.

## КВАТЭРА-МУЗЕЙ

Кватэра Карпюкоў — сапраўдны музей баявой славы. На адной сцяне — вінтоўка, на другой — шашка, над тэлевізарам — партрэты дзяржаўных дзеячаў, кадры з ваенных фільмаў. Ваенны гардэроб у сямейства зайздросны. Нават на кінастудыях, напэўна, такога няма. І рэжысёры, якія здымаюць стужкі ваенных часоў, гэтым карыстаюцца. На сцяне якраз пост з аднаго з такіх фільмаў пад назвай «Бравы» — пра савецкае казацтва часоў Вялікай Айчыннай вайны. З нямецкім абмундзіраваннем былі праблемы, да таго ж патрэбны быў фактурны герой на ролю нямецкага афіцэра. І Эдуард падышоў па ўсіх параметрах. Ён фашыстаў цярпець не можа, але ж трэба было камусьці паказваць сутнасць акупантаў. У фільме «Бравы» ён здымаўся ў нямецкай форме са свайго «гардэроба», яго адразу ж зацвердзілі на ролю нямецкага афіцэра. Фільм пакуль не выйшаў, але фрагменты ў інтэрнэце можна знайсці. Кіно, дарэчы, стваралі прадстаўнікі беларускага казацтва. І Эдуард вырашыў уступіць у яго шэрагі. Нават форму ўжо прыдбаў.

Софія спяшаецца паведаміць, дзе яшчэ што ў таты ляжыць. На антрэсолях захоўваецца рыштунак — падсумкі, кабура. Яшчэ адна шафа — гэта адзенне рабочае, Эдуард — чалавек ваенны. Ён удакладняе, што ў зале захоўваецца ў асноўным летняе ваеннае адзенне, а ў спальні — зімовае. Там жа і шынялі — савецкія і нямецкія.

**Ваенны гардэроб у сямейства зайздросны. Нават на кінастудыях, напэўна, такога няма. І рэжысёры, якія здымаюць стужкі ваенных часоў, гэтым карыстаюцца.**

Самае цікавае — гэта зброя. Ёсць вельмі ўнікальныя асобнікі.

— Вось гэта рэдкая штука — ПКС 43 — пісталет-кулямёт Судаева, — дэманструе ваенную «цацку» рэканструктар. — Пісталетаў-кулямётаў Шпагіна — ПКШ — было выпушчана 9 мільёнаў, а Судаева — адзінкі, яны на ўзбраенне паступілі ў 1943 годзе.

Вага кулямёта адчувальная. Хоць Наталля так не лічыць. Прызнаецца, што падчас колішняй маштабнай рэканструкцыі вызвалення Магілёва на Дзень горада бегала з ім і цяжкасці не адчувала.

Зброя ўся разукамплектаваная, адным словам — макеты. Толькі не самаробныя, а сапраўдныя — тыя, што калісьці былі на ўзбраенні. Шмат што падорана, нешта спецыяльна набыта.

У калідоры абутак — на антрэсолях. Ідзём глядзець, як выглядалі падчас вайны нямецкія боты. «Падэшва каваная — скура і метал, таму ногі зімой у іх адмярзалі», — з выглядам знаўцы каментуе мой гід. На камодзе перакідны каляндар з выявай фрагментаў газет ваеннага перыяду. Каляндар ад 2015 года, але інфармацыі цікавай столькі, што яго сямейства выкарыстоўвае і цяпер.

На балконе працяг музея — савецкі і нямецкі перыяд. «Гаража няма, таму балкон — мая тэрыторыя», — усміхаецца Эдуард. Шмат падарункаў з розных краін, кнігі, каскі на любы густ. У вольны час Эдуард тут рэстаўрыруе каскі. Паказвае нямецкую, якую сам давёў да патрэбнай кандыцыі. Нямецкія рэчы збірае для таго, каб перадаць тую эпоху.

На рэканструкцыі ваенных падзей бацькі абавязкова бяруць дзяцей. І што такое Хатынь, нават маленькай Соне тлумачыць не трэба. Сужэнцы з'яўляюцца членамі грамадскай арганізацыі «Патрыёты Беларусі». А яшчэ Эдуард і Наталля — члены Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру». Разам з іншымі байцамі клуба Эдуард выязджае на сустрэчы са школьнікамі, дапрызыўнай моладдзю. І, натуральна, уласныя экспанаты паказвае. На школьных святах патрыятычнага кірунку часта ладзіць салюты за свой кошт.




## ГРОНКА БЭЗУ Ў ПАДАРУНАК

Прашу Наталлю падзяліцца жыццёвай мудрасцю, як захаваць дружную сям'ю, навучыць розуму дзяцей. Умець саступаць, не заўважаць нешта, даравацъ, калі крыўдна?

— У сям'і маіх бацькоў ніколі не высвятлялі адносіны, — кажа яна. — Магчыма, яны і сварыліся, але мы, дзеці, гэтага не бачылі. Мы жылі ў вёсцы, і ў нас была вялікая гаспадарка — чатыры каровы, сем свіней, трусы. Бацька быў перадавіком у калгасе. І маці, і мы ім ганарыліся. Калі з Эдуардам прыехалі ў вёску, каб пазнаёміўся з бацькамі, яго адразу ж у сям'ю прынялі, адчулі сваяцтва душ. Распісвалі нас 8 Сакавіка ў мясцовым клубе — там ішоў канцэрт, яго перарвалі і запрасілі нас на сцэну. Сардэчна павіншавалі, а музыканты Ала з Мікалаем Яцковы выканалі для нас песню «Гронка бэзу». Пра нас нават у раённай газеце напісалі. Мы яе дагэтуль захоўваем і песню не забываем.

Надвор'е ў доме залежыць і ад умення гаспадыні гатаваць. Эдуард любіць перчык фаршыраваны, качачку смажаную, рулечку, чырвоны боршч, прыгатаваныя Наталляй. «Бульбачку печаную, якую я раблю», — дадае Паліна. «А яшчэ я люблю, калі мы нешта робім разам, — дадае бацька. — І ў нас няма такога, што мы цішком нешта асабіста для сябе купілі. Мая зарплатная картачка знаходзіцца ў Наталлі, але што купляць, вырашаем разам. Ні адна жонка не вытрымала б маіх выдаткаў на хобі, а мая ўспрымае гэта нармальна. І я ёй вельмі ўдзячны».

— Напэўна, для мужчыны крышачку крыўдна быць бацькам адных дачок, — правакую напаследак Эдуарда.

— Так, — хавае ўсмешку Эдуард і хітра паглядае ў бок дзяўчат. Тыя робяць выгляд, што злуюцца, і ў адзін голас абураюцца: «Што ты сказаў?» Усе весела рагочуць. Эдуард абдымае дзяўчат і па-філасофску вымаўляе: «Дочкі — гэта добра. Значыць, вайны не будзе».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з сямейнага архіва КАРПЮКОЎ.**

# Калі маме даражэй бутэлька...

## Жаночы алкагалізм як праблема дзіцяці

**Маці — святло і сонца ў хаце... Але, на жаль, гэта не заўсёды так. Як ні прыкра, але часам здараецца так, што думкі жанчыны звязаны не з клопатам аб дзіцяці, а з пастаяннымі пошукам грошай на пакупку чарговай «дозы».**

### «Не жыве, а прапівае сваё жыццё»

«Жаночы алкагалізм — вялікая праблема, — кажа Вікторыя (імя жанчыны па этычных прычынах зменена). — Усё пачынаецца вельмі нявінна — з кактэйляў, але з часам мера нармальнай колькасці ўжывання алкаголю размываецца. Калісьці табе падавалася, што келіх віна — норма, а праз нейкі час бутэлька ў дзень ужо не праблема. Так здарылася і з маёй мамай. Яны з татам вельмі шмат працавалі і сваю стомленасць развейвалі пры дапамозе алкаголю. Калі раней тое падавалася свавольствам — то цяпер гэта алкагалізм, які высмоктвае жыццё з чалавека. Я была дзіцем, і, калі бацькі пілі, гэта станавілася нагодай папрасіць больш салодкага ці падштурхнуць да пакупкі новых рэчаў. Але калі гэта перарастае ў сваркі і лаянку, ты пакутуеш і гатовы схавацца так, каб цябе не змаглі знайсці. Мне пашанцавала: у мяне была сястра, разам лягчэй было адключацца ад таго, што адбывалася. Мяне выцягваў яшчэ спорт, бо з-за моцнай занятасці на трэніроўках усё ўспрымалася лягчэй... П'янства маці ў любым выпадку адбіваецца на дзіцяці. Адчуваю, што я вельмі эмацыянальная і з лёгкасцю магу расплакацца ў нязначнай сітуацыі. Але, гледзячы на сітуацыю з бацькамі, дакладна разумею, што гэта не мой шлях і не мая хвароба! Я чытала кнігі, шукала ў сабе сілы не пражываць іх жыццё. Але адназначна мне балюча і крыўдна за іх! Бо яны заўсёды рухаліся кудысьці і да чагосьці імкнуліся, а алкаголь перашкодзіў ім дабіцца тых мэт, якія для сябе ставілі. І самае страшнае, што яны не жывуць, а прапіваюць сваё жыццё. Я спрабавала дапамагчы. Прывозіла дадому ўрачоў, ледзь не сілай адвезла на лячэнне, але кадзіроўка дапамагла роўна на тры гады. Потым ізноў моцныя запоі. І гэта не проста запоі — цела за гэты час мяняецца. Цяпер мама выглядае не як жанчына 50 гадоў, якая большую частку свайго жыцця займалася спортам, а як старэнькая бабулька. Я зразумела, што адзінае, чым магу дапамагчы, — падтрымаць у той момант, калі яна прызнае сваю хваробу і скажа, што сама хоча змяніць сваё жыццё!»

### Пра эмацыянальныя арэлі, пачуццё сораму і прапрацоўку траўмы

Мама, якая выпівае, — адно з самых вялікіх няшчасцяў для дзіцяці. Як правільна паводзіць сябе сыну ці дачцэ ў гэтай сітуацыі? Ці можна дапамагчы блізкаму чалавеку пачаць лячэнне ад алкагалізму альбо застаецца толькі змірыцца з паступовай дэградацыяй і кожны дзень чакаць бяды? На гэтыя і іншыя пытанні адказвае **дзіцячы і сямейны псіхолаг Таццяна ШАРАНДА**.

— У кожнай жанчыны-алкагалічкі свой шлях: хтосьці пачынае злоўжываць з юнацкіх гадоў, другіх «багна» зацягвае пазней. На жаль, у гэтай каварнай хваробы няма ні полу, ні ўзросту. Затое даўно навукоўцамі даказана, што жаночы алкагалізм вельмі цяжка паддаецца лячэнню... Справа ў тым, што алкагольная залежнасць у жанчын развіваецца ў 5-6 разоў хутчэй, чым у мужчын, і носіць больш яркі таксічны эфект. Калі мужчыну, каб спіцца, патрэбны гады, то жанчыне дастаткова і некалькіх месяцаў.

**У хлопчыкаў і дзяўчынак, якія растуць з маці-алкагалічкай, шмат праблем, у тым ліку і з самаацэнкай, якая ў іх ніжэйшая за плінтус. Таму вельмі важна, каб з імі працаваў педагог-псіхалаг.**

Акрамя таго, жаночы алкагалізм больш асуджаецца грамадствам. І тут замкнёнае кола. Чым больш грамадства асуджае, тым больш жанчына хавае сваю залежнасць. Таму вельмі часта жаночы алкагалізм выяўляецца на позніх тэрмінах...

***— Жаночы алкагалізм негатыўна ўплывае на дзіцячую псіхіку. Нездарма ж ёсць старая народная мудрасць: «Калі п'е муж, гарыць дах. Але калі п'е жонка, гарыць увесь дом». Што адчуваюць дзеці, з якімі праблемамі сустракаюцца і як іх пражываюць?***

— Мама, якая п'е, — сапраўды, на парадак страшнейшая за татуалкаголіка. Дастаткова распаўсюджаная сітуацыя, калі жанчына пачынае піць пасля нараджэння дзіцяці. Прычынай можа стаць любая стрэсавая сітуацыя, напрыклад, тое, што муж пачынае здраджваць ці сыходзіць з сям'і. Яна застаецца адна з дзіцем і, спрабуючы збегчы ад рэальнасці, пачынае гасіць стан трывогі і страху перад будучыняй алкаголем. Дзіця ж становіцца заложнікам сітуацыі і з самага нараджэння расце ў нестабільным псіхалагічным клімаце. Для мамы, якая пад уплывам стрэсу выпівае, характэрныя пастаянныя эмацыянальныя арэлі, перапады настрою. Сёння раніцай яна абдымае дзіця, а вечарам можа на яго накрычаць проста таму, што яе раздражняе дзіцячы плач. Тое, што раніцай было добра, вечарам становіцца дрэнна. Дзіця не разумее, што адбываецца, не ведае, як сябе правільна паводзіць. У выніку ў яго фарміруецца вельмі высокі ўзровень трывожнасці, страх не дагадзіць маме. (Калі ў сям'і яшчэ і такі ж тата ці сужыцель-алкаголік, то сітуацыя пагаршаецца...) Страх, трывога, напружанне, няўпэўненасць у сабе адбіваюцца на развіцці дзіцяці, яны будуць блакіраваць інтэлектуальныя здольнасці ў малечы.

Па меры сталення да страху і трывожнасці пачынае дадавацца пачуццё сораму за паводзіны маці... (Часта ад сваіх ужо дарослых кліентаў я чула: «Мама п'е, а мне так сорамна, што я гатова праваліцца скрозь зямлю».) Сорам перад суседзямі, аднакласнікамі, настаўнікамі, калегамі мамы па рабоце, якія тэлефануюць і шукаюць яе падчас чарговага запою. Дзеці пачынаюць хлусіць. Яны не хочуць, каб іх шкадавалі, таму прыкрываюць маці-алкагалічку. Звычка хлусіць, дарэчы, можа застацца на ўсё жыццё. У выніку падлеткі замыкаюцца ў сабе, становяцца скрытнымі і замкнёнымі. Для многіх з іх характэрная дэпрэсія, суіцыдальныя думкі.



Ужо потым, як ні парадаксальна, у такіх дзяцей можа развівацца пачуццё віны, уласнай непаўнавартаснасці: «Гэта я ва ўсім вінаваты, я прапускаў урокі, дрэнна вучыўся, таму настаўнікі сталі хадзіць да маёй мамы». У хлопчыкаў і дзяўчынак, якія растуць з маці-алкагалічкай, шмат праблем, у тым ліку і з самаацэнкай, якая ў іх ніжэйшая за плінтус. Таму вельмі важна, каб з імі працаваў педагог-псіхалаг. Апошні павінен растлумачыць дзецям, што яны не вінаваты ў паводзінах матулі і не павінны сябе карыць за тое, што яна п'е.

***— Што рабіць дзіцяці, калі мама п'е кожны дзень?***

— Перш за ўсё, трэба паспрабаваць знайсці дапамогу ў сваякоў, расказаць ім пра залежнасць маці. Ідэальна, калі дзяцей зможа забраць да сябе адэкватная бабуля. Калі ж нікога няма, то ўся надзея на сацыяльныя службы, выхавацельку, настаўнікаў, якія звернуць увагу на знешні выгляд дзіцяці, яго псіхаэмацыянальны стан. Бо, на жаль, дзеці не могуць самі сябе абараніць...

Падлеткам я параіла б у першую чаргу думаць пра сябе, свой псіхічны стан. Калі мама пасля чарговай п'янкі пачала крычаць, не паддавацца на правакацыю. Горшае, што можа зрабіць дзіця, — пачаць крычаць у адказ на яе крык. Падобныя паводзіны могуць вывесці жанчыну з сябе, і справа дойдзе да рукапрыкладства. Жыць з мамай-алкагалічкай звышскладана. Трэба неяк паспрабаваць выжыць у такой сітуацыі, не ператварыцца ў жанчынаненавісніка па жыцці. Раю засяродзіцца на сваіх захапленнях, падумаць аб будучай прафесіі, бо падлетак у сілах выправіць і наладзіць толькі сваё жыццё, а не лёс мамы.

Не так даўно я стала сведкай сумнай гісторыі. Да аўтобуснага прыпынку, на якім я стаяла, пад'ехаў аўтобус, людзі выйшлі, частка зайшла. Хлопчык гадоў 5-6 пачынае бегаць ад адных дзвярэй да другіх, правальваючыся ў снег, крычыць, плача, кліча бабулю. Пашанцавала, што кіроўца ўвайшоў у сітуацыю, не зачыніў дзверы, чакаў, калі з'явіцца бабуля. І тут па сходах спускаецца жанчына — сінюшная, худая, спецыфічна апранутая, з прапітым тварам і пракураным голасам. Груба звяртаецца да хлопчыка і зацягвае яго за руку ў аўтобус... Я не ведаю, чыё гэта дзіця — яе сына ці дачкі. Але ведаю адно: нармальная мама ніколі не даверыць сваё дзіця такой бабулі. Таму мяркую, што тая бабуля дала жыццё пэўнай колькасці бацькоў-алкаголікаў. Гэты хлопчык дагэтуль стаіць у мяне перад вачыма. Можна толькі ўявіць, у якім пекле ён жыве і праз што праходзіць...

Маленькае дзіця і маці, якая п'е, — несумяшчальныя. Нічога добрага ў гэтай сітуацыі не варта чакаць. Работнікі прытулкаў гэта разумеюць, менавіта таму стараюцца як мага раней выявіць неспрыяльныя сем'і і часова ізаляваць малых, даць шанц бацькам адумацца і своечасова выкарабкацца з «багны». Позняе выяўленне дрэннае тым, што дзеці (гэта закладзена прыродай) з нараджэння пераймаюць мадэль паводзінаў сваіх гора-маці, таму з часам, на жаль, становяцца іх копіяй. І тады дапамагчы ім выправіцца ўжо складана.

**Даследаванні псіхолагаў паказалі, што дарослыя дзеці бацькоў-алкаголікаў хоць і не п'юць, але маюць тыя ж праблемы, што і залежныя ад алкаголю, бо з дзяцінства пераймалі алкагольныя мадэлі паводзін.**

***— Ці можа дзіця неяк дапамагчы сваёй маці?***

— Як паказвае практыка, практычна нерэальна выцягнуць жанчыну з алкагалізму, ніякія ўгаворы, дэманстрацыя любові і ахвярнасць, якую часта дзеці, асабліва дзяўчынкі, праяўляюць у адносінах да сваёй мамы, не працуюць. Звычайна ў залежных людзей уключаецца абарончы механізм, і яны адмаўляюць праблему. Пачаць лячыцца залежная жанчына можа толькі тады, калі сама гэтага захоча. Алкагалізм — каварная хвароба, трэба вялізная сіла волі, каб з ёй справіцца.

***— Што рабіць, каб дзіця не паўтарыла шлях гора-маці, а жыло іншым жыццём?***

— Дзеці алкаголікаў вырастаюць і, як правіла, дзеляцца на дзве групы. Адны пераймаюць мадэль паводзін маці і сыходзяць у асацыяльны лад жыцця з усімі наступствамі. Іншыя ж выбіраюць дыяметральна супрацьлеглае: жорстка прытрымліваюцца здаровага ладу жыцця, дэманструюць сваю агіду да спіртнога. Сярод апошніх ёсць тыя, якія спрабуюць даказаць сваёй маме-алкагалічцы, якая іх прыніжала, абражала, што яны нешта значаць. Яны добра вучацца, паступаюць у ВНУ, займаюць высокія пасады. Тым не менш яны паступова «выпальваюць» самі сябе знутры, на жаль, для іх характэрныя псіхасаматычныя захворванні.

Даследаванні псіхолагаў паказалі, што дарослыя дзеці бацькоў-алкаголікаў хоць і не п'юць, але маюць тыя ж праблемы, што і залежныя ад алкаголю, бо з дзяцінства пераймалі алкагольныя мадэлі паводзін. У іх псіхіка залежнага чалавека. Дарослыя дзеці алкаголікаў жывуць з адчуваннем, што з імі штосьці не так — яны бясконца спрабуюць угадаць, што такое норма, як ім сябе паводзіць. Яны бязлітасна сябе крытыкуюць, што б ні зрабілі. Яны залежаць ад адабрэння наваколля і бясконца яго шукаюць. Жывучы ў праблемнай сям'і, яны не маглі з яе сысці і, з прычыны свайго дзіцячага мыслення, ускладалі адказнасць за тое, што адбываецца, на сябе. Тое ж мы бачым і ў дарослым жыцці. Яны, напрыклад, церпяць, калі ім месяцамі не плацяць зарплату. Або, баючыся, што іх пакінуць, гатовы падладжвацца пад любыя патрабаванні партнёра, адмаўляючыся ад сваіх жаданняў.

Калі маці злоўжывала алкаголем — гэта адна з самых цяжкіх і глыбокіх дзіцячых псіхатраўмаў. Яна быццам бы не кідаецца ў вочы, але ўсё жыццё будзе «сіфоніць». Да таго часу, пакуль чалавек не набярэцца смеласці і не пачне разбірацца, што з ім адбываецца. Бо, каб ад яе пазбавіцца, недастаткова катэгарычна для сябе не прымаць паводзіны мамы. Траўму абавязкова трэба прапрацаваць. Самае складанае — навучыцца не падманваць сябе. Гэта першы крок. Вельмі важна пазбавіцца ад пачуццяў нянавісці і крыўды ў адносінах да маці, якія разбураюць знутры. Прыняць той факт, што бацькоў не выбіраюць.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Пустата, якая ўзнікла з-за нездаровых адносін, найбольш эфектыўна лечыцца толькі правільнымі адносінамі. Такімі, у якіх ёсць месца павазе, падтрымцы, клопату і блізкасці. Каб сусрэць такога партнёра, неабходна, каб чалавеку з сіндромам «дарослае дзіця бацькоў-алкаголікаў» моцна пашанцавала. Другі шлях — гэта работа з псіхолагам, прычым лепш, калі гэта групавая тэрапія. Усе, напэўна, чулі пра групы ананімных алкаголікаў, але мала хто ведае, што ёсць яшчэ і групы для дарослых дзяцей бацькоў-алкаголікаў (таксама ананімныя і бясплатныя). Там вы знойдзеце тых, чые маці п'юць. Гэта вялізная тэрапеўтычная каштоўнасць — зносіны з людзьмі, якія перажываюць аднолькавыя сітуацыі.

# ХТО Ў ДОМЕ ГАСПАДАР?

## Ці існуюць мужчынскія і жаночыя абавязкі

**ТЭМА размеркавання хатніх абавязкаў для многіх маладых становіцца «непад'ёмнай» у сямейных стасунках. Паспрабуем разабрацца, што павінен і не павінен рабіць мужчына і пры чым тут вашы бацькі.**

**Традыцыйна лічыцца, што на мужчыну ўскладаюцца ў асноўным тэхнічныя і фізічна цяжкія справы: паправіць кран, павесіць паліцу, перанесці цяжкія рэчы. Яшчэ з даўніх часоў жанчынам адводзяць ролю гаспадыні — захоўваць сямейны ачаг, гатаваць ежу, займацца прыборкай. Аднак сёння свет змяніўся: жанчыны больш не абмежаваныя ў кар'еры, а мужчыны маюць права на дэкрэтны адпачынак. Таму хатнія абавязкі мужчыны могуць быць самымі рознымі.**

Сярод маіх сяброў шмат сем'яў, дзе ежу гатуе толькі мужчына. І ён жа з'яўляецца асноўнай крыніцай даходу ў сям'і. Проста так склалася, што ў канкрэтнай пары гатаванне ежы стала абавязкам моцнай паловы. Таксама я ведаю сем'і, дзе на жанчыне ляжыць адказнасць за даход, і гэта не выклікае скандалаў і рознагалоссяў. Ролі могуць мяняцца, дадавацца і пераразмяркоўвацца паміж мужам і жонкай. У гэтым няма нічога страшнага. Таму ў першую чаргу мы павінны сказаць сабе і адно аднаму, якая расстаноўка зон адказнасці будзе для нас прымальная.

### Я ПРОСТА ПАВАЖАЮ ЖОНКУ

Калі хочаш разабрацца ў сітуацыі, раскажы спачатку пра сябе. Ці так у цябе ўсё бясхмарна, або грымоты і маланкі лётаюць пры кожным спрэчным пытанні? Практычна я магу рабіць усю хатнюю працу і выконваю яе, на мой погляд, вытатна. Магу, але не заўсёды раблю, таму што ў кожнага ёсць свае абавязкі, якія скláліся дзякуючы ўменню, фізічным (псіхалагічным) асаблівасцям і элементарнаму жаданню.

**З часам разумееш, што мужчыну лепш за ўсё хадзіць па крамах разам з жонкай. Яна будзе выбіраць, што купіць, а ён панясе цяжкія сумкі.**

Напрыклад, пасля таго як я купіў новую пральную машыну, першы час (дзесьці каля двух месяцаў) ёю займаўся выключна сам. Я менавіта я прачытаў інструкцыю аб тым, як яна працуе, ад чаго ламаецца і як яе даглядаць. Потым патлумачыў жонцы прынцып гэтай працы, на «пальцах» паказаў, як «заводзіцца» і выключаецца новая «цацка». Так, пару разоў прыйшлося тлумачыць паўторна, але цяпер яна з дадзенай тэхнікай нават сябруе.

З пыласосам усё аказалася складаней. Ён гудзе, моцна гудзе. Для жаночай логікі (або натуры) гэта прадстаўляе пэўную небяспеку. Плюс яго перыядычна трэба разбіраць, каб дастаць адтуль смецце. Выцягнуць з тэхнікі смецце атрымліваецца, сабраць пыласос назад — не... Цяпер майстэрству зносін з пыласосам навучаю свайго сына.



А яшчэ я купіў сучасную швабру для паскоранага мыцця падлогі. Яна вельмі зручная ў эксплуатацыі і якасці прыборкі, але... яе таксама трэба перыядычна разбіраць, каб дадаваць раствор. Як выхад з сітуацыі — швабрай цяпер таксама карыстаецца сын.

Хоць прас, як і ўсё, звязанае з бытавой тэхнікай, купляў і наладжваў я, ён мне не падабаецца чыста гіпатэтычна. Аказалася, што прасаванне бялізны — хатняя праца, якую мужчыны катэгарычна не прымаюць. Нават калі заўтра трэба ісці на важную сустрэчу ў адпрасаванай кашулі, максімум што мы зробім — пагладзім яе пярэднюю частку і надзенем пінжак, каб не было відаць пакамечаной спіны і рукавоў.

Наша сям'я жыве, лічы, у супрацьфазе. Я «жаўрук», а жонка — «сава». У выхадныя, у крыху больш за шэсць гадзін раніцы, я ўжо на нагах. І ў мяне ўзнікае вострае жаданне прыгатаваць штонебудзь смачненькае. Але для пачатку вару кампот з сухафруктаў. Потым раблю мясныя паўфабрыкаты для катлет або адбіўных ці рыхтую рыбу для запякання.

Наогул мы, хлопцы, можам гатаваць ежу па выхадных або па жаданні. Многія мужчыны не проста ўмеюць, а любяць гатаваць. Аднак у штодзённасці рэдка хто з іх гэтым займаецца, на жаль. Часам варта папесціць сям'ю нядзельнымі бліцамі або прыгатаваць рамантычную вячэру для каханай жонкі.

Спецыяльна для мужчын вынайшлі мультыварку. Для тых, хто не вельмі любіць стаяць ля пліты, інжынеры прыдумалі хітрую каструльку, якая і парыць, і смажыць, і пячэ. Закінуў у яе ўсе інгрэдыенты, націснуў кнопку з праграмай і сышоў займацца іншымі справамі. Зручна і проста.

Мыццё посуду ў мяне (як і ў большасці мужчын) выклікае вострае непрыманне. Калі ракавіна поўная, мы проста пакінем брудную талерку на стале, а замест шклянкі прыхопім кубак са святочнага сервіза. Пагадзіцца на ролю пасудамыйкі мы можам толькі ў выключных выпадках і звычайна пасля некалькіх напамінаў.

Пры гэтым увесь брудны посуд павінен быць ужо ў ракавіне. Тое, што стаіць на стале, пліце і ў пакоях, хутчэй за ўсё, застанецца забытым і незаўважаным. Лепшы спосаб далучыць мужчыну да абавязку па мыцці посуду — прымусіць яго купіць добрую, высокатэхналагічную пасудамыйку. Загружаць яе яму нават спадабаецца, калі кошт не пакусае.

Ёсць і не зусім станоўчыя для мяне прыклады. Здавалася б, паход па прадукты — гэта сапраўдная мужчынская справа. Мужчына, як вядома, здабытчык, таму павінен без пярэчанняў наведваць прадуктовыя крамы. У маім выпадку для гэтага павінны выконвацца дзве абавязковыя ўмовы: наяўнасць спісу і адсутнасць жанчыны побач. Але, як аказалася, я не ў стане доўга хадзіць і выбіраць тавары, як гэта робіць мая жонка. Калі мне трэба купіць незнаёмы прадукт, я магу засумнявацца і тут жа патэлефанаваць жонцы. Але ў цэлым мы, мужчыны, робім пакупкі вельмі хутка і выразна, не адцягваючыся на імпульсіўныя жаданні і цікаўнасць. Наш мужчынскі недахоп: калі ў краме прапануюць па акцыі (нават амаль бясплатна) той прадукт, які ў нас не запісаны, то мы яго ніколі і не купім.

З часам разумееш, што мужчыну лепш за ўсё хадзіць па крамах разам з жонкай. Яна будзе выбіраць, што купіць, а ён панясе цяжкія сумкі. Акрамя таго, мужчына атрымае рэальнае ўяўленне пра тое, колькі насамрэч каштуюць прадукты, і перастане задаваць пытанні накшталт «куды дзяваюцца грошы».

### ЧЫСТА НАШЫ СПРАВЫ. І НЕ НАШЫ

Гаворка пойдзе аб трох відах абавязковых спраў моцнага полу. Пад першым маецца на ўвазе тэхніка. Калі ў доме пацёк кран, зламаўся змешвальнік, пад пральнай машынкай лужына, то мужчына павінен узяць рашэнне гэтых праблем на сябе. Калі сам не можа адрамантаваць, значыць, хай знойдзе таго, хто хутка і якасна ліквідуе непаладкі.

Сюды я аднёс бы і заточванне нажоў. Бо нездарма кажуць, што калі ў доме тупыя нажы, значыць, там няма сапраўднага гаспадара.

Другое, што павінен умець гаспадар, — пераадольваць форс-мажорныя абставіны. У гарадскіх рэаліях гэта ліквідацыя нязначных непаладак у кватэры. Напрыклад, адклеіліся шпалеры, у ваннай адышла плітка, заядае дзвярны замок, разетка заіскрыла, перагарэла лямпачка. Навошта жанчыне ўнікаць у такія рэчы, калі дома ёсць мужчына? Хай ён адчуе сябе сапраўдным гаспадаром.

Трэцім кірункам будзе падтрыманне ў парадку асабістых рэчаў. Мужчына павінен сам мыць ніжнюю бялізну, шкарпэткі, прасаваць офісны касцюм, кашулю і чысціць абутак. Гэта справа яго асабістага іміджу, вонкавага выгляду, пра які павінен паклапаціцца ён, а не яго жонка ці любімая жанчына.

**У кожнага чалавека ёсць справы, якія ён цярпець не можа. Для адных гэта мыццё посуду, хтосьці не любіць выціраць пыл, іншыя не выносяць гатавання. І наадварот.**

### ФІЗІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ І АСАБІСТЫЯ ПЕРАВАГІ

Ёсць праца, для выканання якой патрэбны мужчынская сіла або высокі рост. Напрыклад, зняць шторы мініяцюрнай жанчыне без дапамогі будзе складана. Або адсунуць цяжкую канапу, каб памыць падлогу. Таксама бываюць нюансы, з-за якіх немагчыма выконваць некаторыя хатнія абавязкі. Так, пасля родаў жанчыне нельга падымаць цяжар і моцна нахіляцца, мыць падлогу і г. д. Адпаведна, мужчына павінен здагадацца, што цяпер менавіта на яго кладуцца дадатковыя клопаты.

У кожнага чалавека ёсць справы, якія ён цярпець не можа. Для адных гэта мыццё посуду, хтосьці не любіць выціраць пыл, іншыя не выносяць гатавання. І наадварот. Бывае праца, якая не раздражняе, а нават радуе. Паводле даследаванняў, 27 % мужчын любяць збіраць мэблю, 35 % ахвотна гатуюць. А 32 % жанчын аддаюць перавагу прасаванню бялізны і раскладванню рэчаў па паліцах. Таму вельмі лагічна дамовіцца, хто і што больш ахвотна будзе рабіць.

Аўтар узяў на сябе смеласць і падрыхтаваў мінімальны спіс задач для мужчыны па доме.

*Выносіць смецце.* Мужчына кожную раніцу выходзіць з дому. Таму захапіць з сабой пакет са смеццем і данесці яго да бака — элементарная задача, гэта не патрабуе асаблівых высілкаў.

*Купляць прадукты.* Каб спрасціць заданне, можна скласці падрабязны спіс пакупак. А яшчэ лепш замовіць самавываз або дастаўку з крамы.

*Адводзіць дзяцей у садок або ў школу.* Зборамі ў гэтым выпадку можа заняцца маці, а тату толькі трэба даставіць дзяцей да месца.

*Развешваць бялізну.* Сартаванне і загрузка бялізны — складаная задача. Таму няхай мужчына выгрузіць з пральнай машыны ўжо чыстыя рэчы і развесіць іх на сушылцы.

*Засцілаць ложак.* Дробная штодзённая праца, якая робіць спальню акуратнай.

*Абслугоўваць аўтамабіль.* Падаўжэнне страхоўкі, тэхагляд, сезонная замена гумы, своечасовы рамонт і мыйка — усё гэта традыцыйна мужчынская зона адказнасці.

*Разаграваць ежу сабе і дзецям.* Паставіць талерку ў мікрахвалёўку або каструлю з супам на пліту — задачы, з якімі справіцца нават дзіця.

*Мяняць лямпачкі.* Выкруціць старую і ўкруціць новую: пяць хвілін працы, а карысць прыкметная.

*Замяняць батарэйкі ў гадзінніках, вагах, цацках.* Купіць адпаведныя па памеры і зараду батарэйкі, замяніць іх і ўтылізаваць старыя.

*Гуляць з дзецьмі.* Дзеці маюць патрэбу ў татавых увазе і клопаце. Гульні і зносіны з татам — важная частка развіцця дзіцяці. Яны даюць пачуццё ўпэўненасці і бяспекі, а таксама паўнавартаснасці і цэласнасці сям'і. Два-тры вечары на тыдзень тата павінен абавязкова ўдзяляць час дзецям.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ЧАМУ НАМ ГЭТА ПАТРЭБНА

Аб'ём хатняй працы нашмат большы, чым здаецца на першы погляд. Штодзённая прыборка для падтрымання парадку, мыццё паўсядзённых рэчаў, гатаванне і купля прадуктаў неабходны кожны дзень. Да гэтага дадаюцца перыядычныя работы: мыццё вокнаў, мыццё штор, замена пасцельнай бялізны, яе мыццё і прасаванне, чыстка сантэхнікі, прыборка халадзільніка, пліты і шаф. І гэты спіс можна працягваць бясконца.

Калі з'яўляюцца дзеці, хатніх спраў становіцца нашмат больш. Маладыя таты часта здзіўляюцца: чаму жанчына стамілася? Яна ж была дома і нічога не рабіла. Але гэта зусім не так.

Псіхолагі сцвярджаюць, што большасць мадэляў паводзін закладваюцца ў дзяцінстве. Паказваючы дзецям сваю ўцягнутасць у справы сям'і, побыт і клопат пра іх, мужчына павышае свой аўтарытэт, вучыць іх працы і самастойнасці. Дзяліць хатнія абавязкі неабходна — так вы зможаце захаваць мір і спакой у сям'і. А калі ў мужчыны ёсць свае справы ў доме, гэта дазваляе яму адчуваць сваю значнасць, аўтарытэт і незаменнасць у вачах блізкіх.

Увогуле, сумеснае жыццё павінна будавацца на ўменні дамаўляцца. Але калі вы і ваша палова проста вырашыце заплюшчыць вочы на беспарадак, то неўзабаве абодва будзеце ў мінусе. Хаос у доме прыводзіць да хаосу ў галаве, а затым і ў жыцці. Гэта, дарэчы, навукова даказаны факт.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 13 февраля 2024 года повторного открытого аукциона с понижением цены на 60 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** после проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка (лоты №№ 1, 2, 3)**, необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14328** общей площадью **692,4** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/10, гараж. **Капитальное строение с инв. № 320/С-38833** общей площадью **4 241,6 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания транспортного цеха** (составные части и принадлежности: А-Автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа» г. Жлобина. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9 | **95 520,00** | 9 552,00 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-34612** площадью **3 453,9 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 8**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-8. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 961/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1 | **166 012,58** | 16 601,26 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-34622** площадью **9 151,1 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 14. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-14. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 961/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1 | **407 349,52** | 40 734,95 |

**Продавец:** ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович.

**Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 01 февраля 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 12 февраля 2024 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.**

